4 Агляд праектаў, ідэяў і канцэпцыяў рэфармаваньня адукацыі ў Беларусі *

Уладзімер Мацкевіч, Сьвятлана Крупнік, Максім Жбанкоў

1991–1994 гг. – гэта пэрыяд пошуку падыходаў, актыўных, хоць і несыстэмных дзеяньняў, скіраваных на рэфармаваньне беларускай сыстэмы адукацыі. Ствараюцца навуковыя, навучальныя і дасьледчыя цэнтры (НІА, РІВШ, РІПА, ІПК) замест тых, што засталіся ў Маскве і што да 1991 г. вызначалі разьвіцьцё адукацыі ў нашай краіне. Прымаецца новы закон аб адукацыі. Адбываецца рост нефармальнай актыўнасьці: паўстаюць першыя прыватныя навучальныя ўстановы, ад дашкольных да ВНУ, узьнікаюць новыя тыпы навучальных установаў (гімназіі і ліцэі). Пачынаецца, хоць і несыстэмная, беларусізацыя адукацыі. Ствараецца нацыянальны часопіс у пытаньнях асьветы «Адукацыя і выхаванне». Беларускі бок навязвае самастойныя міжнародныя кантакты і ўдзельнічае ў міжнародных праграмах, краіна далучаецца да асноўных міжнародных дамоваў і канвэнцыяў у сфэры адукацыі. Навуковыя цэнтры асвойваюць рынкавыя формы фінансаваньня сваіх распрацовак. *Кульмінацыя гэтага пэрыяду – сэсія-сэмінар (25.10.1994 г.) для кіраўнікоў адукацыі.*

---

* Аўтары выказваюць падзяку Міхаілу Гусакоўскаму, Аляксандру Палоньнікаву і ўсім, хто браў удзел у абмеркаваньні нашае працы.

Пасьля абвешчаньня незалежнасьці Рэспублікі Беларусі спатрэбілася неадкладная рэформа сыстэмы адукацыі.

Да 1991 г. сыстэма адукацыі БССР была рэгіянальным падразьдзяленьнем сыстэмы адукацыі СССР. І ў такой якасьці яна зусім недарэчна выглядала ў сувэрэннай краіне.

Паводле стану на 1991 г. (год распаду), сыстэма адукацыі СССР, а значыць і БССР, знаходзілася ў працэсе рэфармаваньня – хранічна няўдалага, непасьлядоўнага і далёкага ад заканчэньня. То бок рэформу адукацыі беларуская дзяржава фактычна ўспадкавала ад БССР. Практычна адразу ж стала ясна, што працягваць рэформу адукацыі, якая пачалася ў СССР у 1984 г., немагчыма, бо ўсе носьбіты ідэяў, аўтары праектаў і канцэпцыяў рэформы, арганізатары і кіраўнікі рэформы адукацыі засталіся ў Маскве, а ў Менску былі толькі выканаўцы. Гадаваньне ўласна беларускіх суб'ектаў рэфармаваньня адукацыі пачалося ў 1989 г., але на момант абвешчаньня незалежнасьці яны не пасьпелі інстытуцыялізавацца.

Пытаньням адукацыі надзялялі ўвагу і палітычныя суб'екты, якія ўтвараліся ў той час (гл., напрыклад: «Праграма Беларускага Народнага Фронту за перабудову „Адраджэньне" (БНФ)», 1989 г.). Фракцыяй БНФ у Вярхоўнай Радзе быў падрыхтаваны Закон «Аб адукацыі»[1] (1991 г.), які заклаў падмурак для пабудовы нацыянальнай сыстэмы адукацыі. Новы закон аб адукацыі прадугледжваў ня толькі дзяржаўную, але і дзяржаўна-грамадзкую форму кіраваньня адукацыяй, стварэньне недзяржаўных навучальных установаў.

Грамадзкая актыўнасьць спрычынілася да:

– стварэньня асацыяцыяў і НДА ў сфэры адукацыі;
– арганізацыі часовых творчых калектываў, якія бралі на сябе заданьні, зь якімі не маглі даць сабе рады дзяржаўныя структуры (у прыватнасьці, яны займаліся распрацоўкай канцэпцыяў і праграмаў разьвіцьця адукацыі ў краіне).

Сярод такіх калектываў варта вылучыць прынамсі тры найбольш прадукцыйныя:

---

[1] Закон «Об образовании» Республики Беларусь. Минск, 1991.

1. Творчы часовы калектыў (ТЧК) пад кіраўніцтвам Уладзімера Пархоменкі і Аляксандра Казуліна. Гэтым калектывам у 1992 г. была распрацаваная *«Канцэпцыя адукацыі і выхаваньня ў Беларусі»*, ухваленая Радай Міністраў 26 сакавіка 1993 г.[2] На аснове «Канцэпцыі» ТЧК распрацаваў таксама *«Дзяржаўную комплексную праграму разьвіцьця адукацыі і выхаваньня ў Беларусі на пэрыяд да 2000 г.»*, якая была зацьверджаная Радай Міністраў 15 лістапада 1993 г.[3]

Асноўная ідэя «Канцэпцыі» — пераўтварэньне сыстэмы адукацыі ў краіне ў паўнавартасную нацыянальную сыстэму, прывязка яе да патрэбаў Беларусі, пераадоленьне рудымэнтаў савецкай адукацыі. Пры гэтым аўтары імкнуліся максымальна наблізіць адукацыю ў краіне да эўрапейскіх узораў. Хаця канцэпцыя й ня ўтрымлівае якога-кольвек разгорнутага абгрунтаваньня мадэлі рэформаў, яна тым ня менш дэкляруе дэмакратычныя, лібэральныя і гуманістычныя прынцыпы, на якіх мяркуецца будаваць будучую сыстэму беларускай адукацыі. Рэалізацыя гэтых прынцыпаў, несумненна, забясьпечыла б паступовую дэсаветызацыю і беларусізацыю нацыянальнай школы ўсіх узроўняў.

Моцным бокам канцэпцыі выступае яе арганізацыйная частка, якая была добра дастасаваная да тых павольных зьменаў, якія былі ўласьцівыя ў той пэрыяд для ўсіх сфэраў жыцьця ў краіне. Канцэпцыя мела таксама добрае кадравае забесьпячэньне. Дапоўненая комплекснай праграмай дзеяньняў, заплянаваных на пэрыяд да 2000 г., канцэпцыя была афіцыйна прынятая да рэалізацыі. Аднак ужо ў 1994 г. выявілася, што яна стварае шэраг непрадугледжаных праблемаў (гл. ніжэй разьдзел пра сэсію-сэмінар МА для кіраўнікоў).

2. Часовы навукова-дасьледчы калектыў (ЧНДК) «Нацыянальная школа Беларусі». Кіраўнік-каардынатар праекту — Аляксандар Казулін. Навуковы кіраўнік — Міхаіл Гусакоўскі. У 1992 г. ЧНДК выдаў *«Тэарэтычныя асновы канцэпцыі нацыянальнай школы Рэспублікі Беларусі»*[4], а ў 1993 г. — *«Канцэпцыю нацыянальнай школы Беларусі»*[5].

---

[2] Адукацыя і выхаванне. 1993. № 10.
[3] Адукацыя і выхаванне. 1994. № 7—8.
[4] Адукацыя і выхаванне. 1992. № 12.
[5] Фактары станаўлення і развіцця нацыянальнай школы Беларусі. Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі (11—13 мая 1994 г.). Менск, 1994. С. 104—155.

Гэтая канцэпцыя будавалася ў адпаведнасьці зь дзьвюма патрэбамі грамадзтва, вылучанымі аўтарамі: забесьпячэньне нацыянальна-культурнай ідэнтыфікацыі (станаўленьне нацыянальна-культурнай ідэнтычнасьці беларусаў) і мадэрнізацыя (уваходжаньне Беларусі як дзяржавы і нацыі ў сусьветную культурную супольнасьць).

Названыя тэндэнцыі набываюць у канцэпцыі форму заданьняў сыстэмы адукацыі. Дзеля іх рэалізацыі ў канцэпцыі выпрацоўваюцца адпаведныя пэдагагічныя тэхналёгіі. Шмат месца адводзіцца аналізу наяўных пэдагагічных тэхналёгіяў, а таксама філязофскаму і псыхалягічнаму абгрунтаваньню тых, якія яшчэ толькі належыць распрацаваць. У канцэпцыі, аднак, практычна не закранаюцца арганізацыйна-кіроўныя, фінансавыя і праўныя пытаньні рэформы адукацыі.

Гэтая і выкладзеная вышэй канцэпцыі ўзаемадапаўняюць адна адну, таму на іхнай аснове, пры неабходнасьці, можна было б выпрацаваць больш цэльны падыход.

3. Часовы навуковы калектыў пад кіраўніцтвам Аляксандра Растунова распрацоўвае *«Канцэпцыю разьвіцьця вышэйшай школы Рэспублікі Беларусі ў новых умовах»*. У іншым складзе (Валянціна Бадун і інш.) распрацоўваецца *«Канцэпцыя разьвіцьця сярэдняй спэцыяльнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусі»*. Пазьней пад кіраўніцтвам А. Растунова была падрыхтаваная *«Дзяржаўная праграма разьвіцьця вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусі ўва ўмовах рынкавых адносінаў»*[6].

Патас гэтай канцэпцыі палягае ў дэмакратызацыі й лібэралізацыі вышэйшай школы і сярэдняй спэцыяльнай адукацыі. Першаступеннае значэньне надаецца праблеме выжываньня навучальных установаў, якая вельмі востра стаяла ў 1991–1993 гг., і праблеме забесьпячэньня акадэмічных свабодаў, у тым ліку свабоды творчае дзейнасьці вучоных і прафэсарска-выкладчыцкага складу. Таму ў канцэпцыі найбольш распрацаваныя разьдзелы, якія тычацца праўных і арганізацыйных аспэктаў кіраваньня вышэйшай школай, а таксама дывэрсыфікацыі крыніцаў фінансаваньня. Канцэпцыя, аднак, не магла быць выкарыстаная

[6] Адукацыя і выхаванне. 1994. № 9–10.

на практыцы, бо адставала ад зьменаў, якія адбываліся на момант публікацыі, у прыватнасьці, яна пакідала па-за ўвагаю ўжо паўсталыя прыватныя ВНУ і платнае навучаньне студэнтаў.

Апрача названых канцэпцыяў, якія былі шырока папулярызаваныя праз СМІ, у гэтыя гады існавалі і лякальныя ініцыятывы, напрыклад, *«Канцэпцыя навучальна-мэтадычнага комплексу (НМК)»*[7] – тэхналягічная распрацоўка падрыхтоўкі сучасных падручнікаў і дыдактычна абгрунтаваных сродкаў навучаньня (Леанід Фрыдман, Барыс Пальчэўскі, Барыс Цітовіч). У той жа час некалькі ініцыятыўных групаў у розных інстытутах пачалі распрацоўку стандартаў адукацыі.

У кастрычніку 1994 г. новы міністар адукацыі Васіль Стражаў замовіў «Агенцтву гуманітарных тэхналёгіяў» (АГТ) правядзеньне сэсіі-сэмінару для пэдагагічных кіраўнікоў «Разьвіцьцё сыстэмы школьнай адукацыі: стан і пэрспэктывы». Акцыя ладзілася ў форме арганізацыйна-дзейнаснай гульні (АДГ). Удзельнікамі АДГ сталіся: 1) група Міністэрства адукацыі (міністар, намесьнікі міністра, начальнікі ўправаў і галоўныя спэцыялісты); 2) кіраўнікі нацыянальных інстытутаў: НІА, РІВШ, РІПА, ІПК; 3) прадстаўнікі мясцовых органаў улады (кіраўнікі аблана, рана, гарана); 4) дырэктары дзяржаўных і прыватных школаў, рэктары ВНУ; 5) распрацоўнікі дзьвюх першых з названых вышэй канцэпцыяў; 6) прадстаўнікі пэдагагічнай навукі; 7) грамадзкія арганізацыі і фонды; 8) СМІ. З улікам таго, што некаторыя з удзельнікаў былі сябрамі палітычных партыяў, прафсаюзу працаўнікоў адукацыі, а шмат хто і бацькамі навучэнцаў, можна лічыць, што на сэсіі-сэмінары былі прадстаўленыя ўсе сацыяльныя аб'екты, зацікаўленыя ў разьвіцьці адукацыі.

Было сфармавана 5 працоўных групаў:

1) інвэстыцыйна-фінансавыя аспэкты кіраваньня адукацыяй;
2) праўныя аспэкты кіраваньня адукацыяй;
3) структурна-функцыянальныя аспэкты кіраваньня адукацыяй;
4) канцэптуальна-праектныя аспэкты кіраваньня адукацыяй;
5) аспэкты кантролю і кіраваньня якасьцю адукацыі.

---

[7] Тэхналагічная адукацыя. 1996. № 3–6.

Па выніках сэсіі-сэмінару была падрыхтаваная брашура *«Аб рэформе адукацыі ў Беларусі ўзору 1994 г.» («Зялёны сшытак»)*[8]. «Зялёны сшытак» быў разасланы прэзыдэнту, старшыню Камісіі ВР у пытаньнях адукацыі, навукі і культуры, міністру адукацыі і навукі, прэзыдэнту Акадэміі адукацыі, старшыню прафсаюзу працаўнікоў адукацыі, старшыню незалежнага прафсаюзу настаўнікаў, старшыню рады дырэктараў школаў. У рэзюмэ канстатавалася, што ніхто ў краіне ня мае адказаў на галоўныя пытаньні па кожнай з працоўных групаў:

1) інвэстыцыйна-фінансавыя аспэкты кіраваньня адукацыяй: колькі каштуе беларуская адукацыя, колькі каштуе рэформа адукацыі;
2) праўныя аспэкты кіраваньня адукацыяй: як рэгулююцца праўныя стасункі ў сфэры адукацыі паміж усімі зацікаўленымі бакамі;
3) структурна-функцыянальныя аспэкты кіраваньня адукацыяй: як будуецца ўзаемадзеяньне і каапэрацыя розных інстытутаў, што ўплываюць на адукацыйную сфэру ў краіне;
4) канцэптуальна-праектныя аспэкты кіраваньня адукацыяй: які праект рэформы адукацыі, на якіх канцэптуальных падыходах ён мусіць засноўвацца;
5) аспэкты кантролю і кіраваньня якасьцю адукацыі: якія нацыянальныя крытэры, мэтады і стандарты ацэнкі якасьці працэсу і прадукту адукацыі.

Усе прадстаўленыя на сэсіі-сэмінары матэрыялы былі фрагмэнтарныя, ня ўзгодненыя міжсобку, а часам і супярэчлівыя адзін аднаму. Давялося прызнаць, што канцэпцыі, праекты і праграмы, пададзеныя ўдзельнікамі і распрацоўнікамі, ёсьць паўфабрыкатамі, заснаванымі на няпоўнай і непраўдзівай інфармацыі, і не вытрымліваюць крытыкі.

Фактычна, рэформу адукацыі ў Беларусі і пабудову яе нацыянальнай сыстэмы неабходна было пачынаць з самага пачатку.

1995—1996 гг. — гэта пэрыяд згарненьня і гамаваньня на дзяржаўным узроўні пачынаньняў папярэдняга пэрыяду. Спыняецца беларусізацыя. Усе інавацыі паступова выцясьняюцца ў нефармальную сфэру, у «трэці сэктар», дзе яны рас-

[8] О реформе образования в Беларуси образца 1994 года («Зелёная тетрадь») //Агентство гуманитарных технологий. Минск, 1994.

працоўваюцца дзякуючы Беларускаму фонду Сораса і іншым альтэрнатыўным крыніцам фінансаваньня. Пашыраецца прыватны сэктар адукацыі. Распрацоўваецца новы закон аб адукацыі. Пэрыяд завяршаецца роспускам Вярхоўнай Рады.

«Дзяржаўная комплексная праграма разьвіцьця адукацыі і выхаваньня ў Беларусі на пэрыяд да 2000 г.», хоць і была зацьверджаная Радай Міністраў, аказалася, аднак, як і многія іншыя дакумэнты падобнага кшталту, што рыхтаваліся ў канцы 1980-х — пачатку 1990-х гг., непрыдатнай для рэалізацыі. Закон «Аб адукацыі» 1991 г., што напачатку адкрыў шырокія магчымасьці для разьвіцьця і інавацыяў, ужо кепска адпавядаў паўсталым зьменам.

Створаныя ў першыя гады незалежнасьці нацыянальныя інстытуты (НІА, РІВШ, РІПА, ІПК) так і не зрабіліся сапраўднымі цэнтрамі нацыянальнага маштабу. Каб зразумець, што беларуская пэдагагічная навука не займалася рэальнымі праблемамі рэформы адукацыі, дастаткова прааналізаваць тэматыку кандыдацкіх і доктарскіх дысэртацыяў (гл., напрыклад: Адукацыя і выхаваньне. 1996. № 12), падрыхтаваных у гэтых інстытутах. Не было абаронена ніводнай дысэртацыі па праблематыцы адукацыі агульнанацыянальнага ўзроўню. Усе тэмы дысэртацыяў тычацца або асобаў навучэнца і пэдагога, або асобнай навучальнай установы. Самая «маштабная» дысэртацыя была прысьвечаная структуры кіраваньня адукацыяй на ўзроўні г. Менску.

У сваіх інстытуцыйных формах беларуская пэдагагічная навука аказалася негатовай адказваць на выклікі часу. А таму далейшыя крокі, зьвязаныя з рэфармаваньнем адукацыі, фактычна рабіліся па-за межамі афіцыйнай навукі. У разгляданы пэрыяд варта вылучыць наступныя ініцыятывы і цэнтры:

1. Працяг працы ЧНДК пад кіраўніцтвам Міхаіла Гусакоўскага. Канцэптуальныя асновы гэтае працы былі ўжо сфармуляваныя ў названай вышэй *«Канцэпцыі нацыянальнай школы Беларусі»*. Замоўцам на працу быў адзін з кіраўнікоў гэтага калектыву Аляксандар Казулін, які стаў намесьнікам міністра адукацыі, а пазьней — рэктарам БДУ. Праца разгортвалася на пляцоўках Беларускага ліцэю, НІА, ІПК кіраўнічых кадраў адукацыі, БДУ і з выкарыстаньнем гэтых рэсурсаў.

2. Распрацоўка новага падыходу да рэформы адукацыі, ініцыяваная міністрам адукацыі і навукі Васілём Стражавым. Гэтая праца вялася пераважна чыноўнікамі. Створаная пад ягоным кіраўніцтвам на базе Каардынацыйнае рады па навуковых досьледах у галіне адукацыі (заснаваная 14 чэрвеня 1993 г.) Беларуская акадэмія адукацыі выявілася нежыцьцяздольнай.
3. Вярхоўная Рада ініцыявала распрацоўку новага закону «Аб адукацыі». Была створана працоўная група, у якую ўвайшоў шмат хто з удзельнікаў згадванай сэсіі-сэмінару.
4. Разгарнулася дзейнасьць праграмаў Беларускага фонду Сораса. У яго «Праграме абнаўленьня гуманітарнай адукацыі» распрацоўвалася *«Канцэпцыя абнаўленьня гуманітарнай адукацыі»* (кіраўнік — Уладзімер Мацкевіч)[9]. Да канца 1996 г. рамкі гэтай канцэпцыі былі пашыраныя, і яна пачала разглядацца як канцэпцыя рэформы нацыянальнай адукацыі ў цэлым.
5. Пры канцы 1995 г. Васіль Стражаў замовіў групе распрацоўнікаў (Уладзімер Мацкевіч, Барыс Пальчэўскі, Леанід Фрыдман, Сьвятлана Крупнік, Генадзь Пятроўскі) альтэрнатыўны праект рэформы адукацыі — *«Аргпраект рэформы адукацыі Рэспублікі Беларусі»*[10].

Аніводная з гэтых ініцыятываў ня мела пэрспэктываў, бо праца адбывалася ізалявана і не ў адпаведных грамадзка-палітычных умовах. Рэформа адукацыі магла пачацца і пазытыўна скончыцца толькі пры падтрымцы дзяржавы і грамадзтва. Дасягнуць такой згоды не ўдалося. Хаця ў папярэднія гады і былі назапашаныя дастатковыя досьвед і матэрыял, былі вызначаныя і зафіксаваныя прабелы ў тым, што ўжо зроблена, мелася яснасьць што да таго, як гэтыя прабелы ліквідаваць, ува ўсіх пералічаных ініцыятывах удзельнічала большая частка спэцыялістаў, нэгатыўныя фактары, аднак, ужо дамінавалі ў краіне.

---

[9] Обновление гуманитарного образования. Информационно-аналитический бюллетень. 1997. № 11; гл. таксама артыкулы «Образование», «Педагогика» //Всемирная энциклопедия: философия. Москва — Минск, 2000.

[10] Оргпроект реформы образования Республики Беларусь // В. В. Мацкевич, Б. В. Пальчевский, Л. С. Фридман и др. Минск, 1995.

А менавіта:

– працягваўся крызыс ідэалёгіі, які набываў усё больш вострыя формы і выліўся пры канцы 1996 г. у дзяржаўны пераварот;
– рэжым, які ўсталяваўся ў краіне, ідэалягічна не ўспрымаў канцэпцыі, заснаваныя на нацыянальных прыярытэтах, дэмакратычных і лібэральных вартасьцях;
– пашыраўся канфлікт паміж міністрам адукацыі Васілём Стражавым, які курыраваў адны ініцыятывы, і ягоным намесьнікам Аляксандрам Казуліным, што падтрымліваў іншыя (і хоць гэты канфлікт ня меў дачыненьня да ідэалёгіі, ён істотна ўскладняў усю працу);
– нарастаў канфлікт паміж Вярхоўнай Радай і прэзыдэнцкай вэртыкальлю. (Прычым старшыня камісіі ВР па адукацыі, які ачольваў працу над новым законам, стаяў на прапрэзыдэнцкіх пазыцыях, а таму фактычна сабатаваў выпрацоўку новага закону.)

У выніку былі страчаныя яшчэ два гады для рэфармаваньня сыстэмы адукацыі ў краіне. З разгонам Вярхоўнай Рады ў лістападзе 1995 г. усё вярнулася да выходнага стану. *«Канцэпцыя нацыянальнай школы Беларусі»* (Міхаіл Гусакоўскі і інш.) і *«Аргпраект рэформы адукацыі Рэспублікі Беларусі»* (Уладзімер Мацкевіч і інш.) былі канчаткова адкіненыя. Створаная замест легітымна абранай ВР ПП НС адкінула падрыхтаваны праект закону «Аб адукацыі» і пачала распрацоўку новага.

Праца групы Міхаіла Гусакоўскага лякалізавалася да маштабаў тых пляцовак, дзе афіцыйна працавалі яе чальцы (пазьней яна зрабілася падразьдзяленьнем БДУ). Праца АГТ (Уладзімер Мацкевіч) была правязаная да праграмы «Абнаўленьня гуманітарнай адукацыі» Беларускага фонду Сораса і спынілася зь яго закрыцьцём на пачатку 1997 г.

Адзіным суб'ектам, які працягваў дзейнічаць у нацыянальным маштабе, засталося Міністэрства адукацыі. Альтэрнатывы не было.

1997–1999 гг. – пэрыяд усталяваньня кантролю над усёй сфэрай адукацыі з боку дзяржавы. Прыватная адукацыя і «трэці сэктар» працягвалі існаваць.

Гэта «мёртвы сэзон» у рэфармаваньні адукацыі. Ён характарызуецца колькімі асаблівасьцямі. Недзяржаўны сэктар, насуперак адсутнасьці нарматыўна-праўнай

базы, бюракратычным перашкодам, фіскальнаму кантролю, эканамічнай стагнацыі, усё ж выжыў і нават пашырыўся. Рос попыт на недзяржаўную адукацыю, і адукацыйны рынак адказваў на гэты попыт пашырэньнем спэктру новых паслугаў. Разам з тым адбылося пашырэньне і паглыбленьне расейскага ўплыву на беларускую адукацыю. Гэта праявілася і ў канцэптуальна-зьместавым, і ў арганізацыйна-тэхналягічным пляне. З Расеі запазычваюцца як ідэі, гэтак і падручнікі ды стандарты адукацыі. Адпаведна згортваюцца ўсе дэмакратычныя дасягненьні ў сфэры дзяржаўнае адукацыі. Прынцып дзяржаўна-грамадзкага кіраваньня, замацаваны ў Законе «Аб адукацыі» 1991 г., канчаткова скасоўваецца. Акадэмічныя свабоды засталіся толькі ў дэклярацыях. У школах і ВНУ цэнтралізавана ствараюцца ячэйкі ляяльных да рэжыму дзіцячых палітычных арганізацыяў (БСМ і БПСМ), на якія не распаўсюджваецца забарона палітычнае дзейнасьці ў навучальных установах. Праваслаўе паступова набывае характар афіцыйна падтрыманае рэлігіі, Расейская Праваслаўная Царква пачынае распаўсюджваць свой уплыў і на школу, дарма што пры гэтым парушаюцца законы «Аб адукацыі» і «Аб свабодзе веравызнаньня».

Вынікам гэтага пэрыяду стаецца пастанова Рады Міністраў ад 12 красавіка 1999 г., № 500 *«Аб асноўных кірунках разьвіцьця нацыянальнай сыстэмы адукацыі»*. Фактычна гэтаю пастановай адмаўляецца ўсё, што рабілася пачынаючы з 1991 г., ажыцьцяўляецца вяртаньне да ідэяў 1984 г. — пачатку рэформы адукацыі ў СССР, толькі ў рамках Рэспублікі Беларусі. Сутнасьць гэтага дакумэнту перадае наступная цытата: «Дасягненьне мэты рэфармаваньня прадугледжвае: захаваньне і разьвіцьцё найлепшых якасьцяў сыстэмы адукацыі, што ўзьніклі ў савецкі пэрыяд; забесьпячэньне апярэджвальнага і адэкватнага рэагаваньня сыстэмы адукацыі на сацыякультурныя пераўтварэньні; фармаваньне сыстэмы адукацыі і выхаваньня, якая адпавядае заданьням новага этапу разьвіцьця грамадзтва». Выразы кшталту «апярэджвальнага і адэкватнага рэагаваньня сыстэмы адукацыі на сацыякультурныя пераўтварэньні» і «новага этапу разьвіцьця грамадзтва» ніяк не раскрываюцца і застаюцца бязьзьместавымі.

2000 г. і далей — пэрыяд поўнага разьмежаваньня дзяржаўнага і нефармальнага сэктараў у адукацыі. «Новая рэформа» адукацыі і новы закон аб

адукацыі не пакідаюць месца для прыватнай і нефармальнай адукацыі, для беларусізацыі і рэальнага рэфармаваньня.

Сучасны пэрыяд у сфэры адукацыі афіцыйна называецца рэформай. У адпаведнасьці з пастановай Рады Міністраў *«Аб асноўных кірунках разьвіцьця нацыянальнай сыстэмы адукацыі»* прадугледжаны шэраг дзеяньняў і крокаў дзеля замацаваньня наяўнага стану рэчаў.

Агульная ацэнка

З увагі на тое, што ў краіне не адбылося рэальнага рэфармаваньня адукацыйнай сыстэмы, па-ранейшаму захоўваюць сваю актуальнасьць распрацаваныя ў папярэднія гады канцэпцыі і праекты, а менавіта:

- *«Канцэпцыя нацыянальнай школы Беларусі»* 1993 г. Яна па-ранейшаму ёсьць падставай для дзейнасьці Цэнтру праблемаў разьвіцьця адукацыі БДУ, у якім працуе частка ЧНДК «Нацыянальная школа»;
- *«Аргпраект рэформы адукацыі Рэспублікі Беларусі»* 1995 г., які будаваўся як праграмная абалонка для ўлучэньня ўсіх напрацовак у сфэры адукацыі. Аргпраект прадугледжвае ўзаемадзеяньне структураў грамадзянскай супольнасьці ў рэфармаваньні адукацыі і дзяржавы. Гэтым праектам кіруюцца ў сваёй працы некалькі незалежных групаў спэцыялістаў і асобныя прадстаўнікі дзяржаўнага сэктару. Палажэньні гэтага аргпраекту выкарыстоўваюцца пры навучаньні мэнэджэраў адукацыі ў АПА і РІПА, пры навучаньні магістраў і асьпірантаў. У рамках рэалізацыі гэтага праекту распрацоўвалася тэма «Функцыянальная пісьменнасьць» (з 1997 г. у лябараторыі мэтадалёгіі прафэсійнай адукацыі РІПА, затым у аддзеле аналітычнай і праўнай працы Міністэрства адукацыі, у апошнія гады ў аддзеле сацыялёгіі АПА, дзе працуюць экспэрты або стажоры АГТ). На замову ЮНЭСКА было падрыхтавана спавешчаньне «Функцыянальная пісьменнасьць у Беларусі»[11], прадстаўленае на штогадовай канфэрэнцыі ЮНЭСКА

[11] В. В. Мацкевич, С. А. Крупник, Функциональная грамотность в системе образования Беларуси. Минск, 2003.

ў Варшаве ў 2000 г. У прыкладной частцы спавешчаньня быў зьмешчаны «Магчымы сцэнар ліквідацыі функцыянальнай непісьменнасьці пры зьмене вонкавых палітычных і эканамічных фактараў» як складовая частка рэфармаваньня адукацыі ў краіне;

– *«Канцэпцыя абнаўленьня гуманітарнай адукацыі»* 1996–1997 гг. Распрацаваная ў разьліку на рэалізацыю праз Беларускі фонд Сораса, пасьля закрыцьця фонду гэтая канцэпцыя сталася падставай для дзейнасьці некалькіх НДА (напрыклад, Асацыяцыі «Абнаўленьня гуманітарнай адукацыі», Беларускай асацыяцыі інавацыйных школаў). Да сёньня яна застаецца найбольш радыкальнай з тых канцэпцыяў, што прапаноўваліся ў Беларусі.

У праграмных дакумэнтах палітычных партыяў адукацыі наагул знаходзіцца месца, але ніводная з партыяў не надзяляла пытаньням адукацыі адмысловай увагі. Палітычныя партыі і грамадзкія рухі імкнуцца падтрымліваць (перадусім у галіне грамадзянскай адукацыі) некаторыя канкрэтныя праекты і ініцыятывы. Гэтак «Народны ўнівэрсытэт: таварыства філяматаў», заняткі якога ладзіліся ўва ўсіх абласных і многіх раённых гарадох краіны, быў створаны пры падтрымцы Хартыі'97. Шмат увагі грамадзянскай адукацыі надзялялі незалежныя і свабодныя прафсаюзы. У рамках адукацыйных мерапрыемстваў прафсаюзаў ня толькі адбывалася навучаньне па спэцыфічных для гэтых арганізацыяў тэмах, але і ліквідоўвалася функцыянальная непісьменнасьць (перадусім праўная, але таксама кампутарная й экалягічная). Цэлы шэраг НДА, што працуюць у грамадзянскай адукацыі, былі створаны пры падтрымцы БНФ, АГП і іншых партыяў. Але ані палітычныя партыі, ані масавыя грамадзкія рухі ня маюць цэльнай канцэпцыі або праграмы дзеяньняў у сфэры адукацыі.

4 Дыягназ сыстэмы адукацыі Беларусі

Максім Жбанкоў, Аляксандар Палоньнікаў

На стан сыстэмы беларускай адукацыі ў папярэдняе дзесяцігодзьдзе паўплывалі некаторыя спробы яе мадэрнізацыі, якія былі зьвязаныя з наступнымі мэтамі адукацыйных трансфармацыяў:

– *«дэідэалягізацыяй»,* якая ставіла заданьне эмансыпацыі зьместу адукацыі ад вартасьцяў і ўстановак камуністычнай ідэалёгіі. Найперш заданьні дэідэалягізацыі рэалізоўваліся ў зьмесьце гуманітарнай адукацыі, аднак рэальная практыка выявілася значна шырэйшай і закранула як сфэру выхаваньня (узоры і вартасьці), так і базавыя ўстаноўкі беларускай адукацыі наагул. Нельга не прызнаць некаторых посьпехаў рэфарматараў у дадзеным кірунку ў пачатку – сярэдзіне 1990-х гг. Сёньня, аднак, аўтарытарная ідэалёгія вяртаецца ў сыстэму адукацыі;

– *«дэпалітызацыяй»,* г. зн. вывядзеньне з школы палітычных інстытутаў КПСС і яе атожылкаў – моладзевых і дзіцячых арганізацыяў. Мэты дэпалітызацыі не былі канчаткова дасягнутыя (некаторыя дзіцячыя і моладзевыя камуністычныя аб'яднаньні, напрыклад, піянэрыя і БРСМ, ня толькі яшчэ існуюць у навучальных установах, але і пры падтрымцы дзяржавы імкнуцца пашырыць свой уплыў);

– *«беларусізацыяй»,* якая мела мэтай перавод выкладаньня ў навучальных установах на беларускую мову. Меркавалася, што для вырашэньня гэтай задачы будзе дастаткова 10 гадоў. Дзеля гэтага стваралiся беларускамоўныя

падручнікі для ўсіх узроўняў адукацыі, уводзілася справаводзтва на беларускай мове, праводзілася атэстацыя і перападрыхтоўка пэдагагічных кадраў, скіраваная на павышэньне кампэтэнтнасьці выкладчыкаў у сфэры беларускай мовы і культуры. Вынікі гэтых намаганьняў сёньня адсутнічаюць. Пры беспасярэднім удзеле органаў кіраваньня адукацыяй «беларусізацыя» аказалася цалкам згорнутай;

– *«дывэрсіфікацыяй»,* або структурнай перабудовай беларускай адукацыі. У выніку яе зьявіліся навучальныя ўстановы рознага тыпу: школы, гімназіі, ліцэі, каледжы, навучальныя комплексы (прафтэхвучэльня – тэхнікум – ВНУ), многія ВНУ (інстытуты) былі ператвораны ўва ўнівэрсытэты і акадэміі, а зьмест навучаньня стратыфікаваны ўзроўнева і спэцыялізавана. У сярэдніх школах пачалі ў вялікай колькасьці ўзьнікаць спэцыялізацыі і «профільныя» клясы «эканамістаў», «юрыстаў», «музыкаў» і г. д. Адным з найважнейшых вынікаў гэтай структурнай перабудовы стала зьяўленьне недзяржаўнай і камэрцыйнай адукацыі, рынку адукацыйных паслугаў. Структурная перабудова закранула навучальныя ўстановы ўсіх тыпаў і ўзроўняў, сфэру дадатковай і пазашкольнай адукацыі;

– *«інфарматызацыяй»*, што была арыентавана на набыцьцё кампутарнай пісьменнасьці ўсімі суб'ектамі адукацыі, забесьпячэньне сучаснымі інфармацыйнымі сыстэмамі ўсіх падструктураў адукацыі, перавод зьместу навучаньня на электронныя носьбіты, падключэньне беларускай адукацыі да сусьветных інфармацыйных рэсурсаў. Хаця ў дазеным кірунку за мінулае дзесяцігодзьдзе зроблена шмат, вынікі, асабліва ў правінцыі, аднак, вельмі нязначныя.

Таму стан беларускай адукацыйнай сыстэмы ў цэлым можна вызначыць як стан рэфармацыйнай стагнацыі, а адукацыйную сыстэму як сутнасна нерэфармаваную. Дэкарацыйныя адміністрацыйныя навацыі апошніх гадоў аніяк не закранулі зьместу адукацыйнага працэсу.

Беларуская адукацыйная сыстэма ўсё меней адпавядае шэрагу сутнасных функцыяў, якія яна павінна выконваць.

Найперш адукацыя павінна судзеяць увесьчаснаму адтварэньню інфармацыйнага рэсурсу як спэцыяльна-прафэсіянальнай, так і грамадзка-палітычнай дзейнасьці асобаў і сацыяльных групаў.

Па-другое, адукацыя мае на ўвазе адтварэньне чалавечага рэсурсу функцыянаваньня грамадзтва. Іншымі словамі, ідзецца пра своеасаблівую «прапіску» індывіда ў канкрэтным сацыяльным асяродзьдзі, навучаньне яго розным тэхналёгіям сацыяльнага (у тым ліку прафэсійнага) дзеяньня.

Па-трэцяе, сыстэма адукацыі — гэта натуральная крыніца фармаваньня новых нацыянальных элітаў, якія неўзабаве будуць вызначаць прыярытэты і кірункі разьвіцьця нацыі.

Па-чацьвёртае, навучальныя ўстановы вышэйшага ўзроўню (вышэйшая школа) традыцыйна былі сфэрай дзейнасьці навуковых супольнасьцяў, занятых ня толькі выкладчыцкай, але і дасьледчыцкай актыўнасьцю.

Нарэшце, функцыянаваньне сыстэмы адукацыі як сацыяльнага інстытуту вымагае наяўнасьці эфэктыўных мэханізмаў кіраваньня і самакіраваньня, здольных забясьпечыць устойлівае разьвіцьцё сыстэмы ўва ўмовах дынамічнага разьвіцьця рэальнасьці постсавецкага тыпу.

Цяперашняя сыстэма адукацыі эфэктыўна выконваць гэтыя функцыі прынцыпова няздатная. Каб пацьвердзіць гэтую тэзу, падрабязьней разьбярэм кожны з пазначаных пунктаў.

Адтварэньне інфармацыйнага рэсурсу

Гэтая праблема мае тры аспэкты: уласна інфармацыйны (зьмест навучаньня), інфармацыйна-мэтадычны (тэхналёгіі адукацыі) і тэхналягічны (інфармацыйная культура).

Зьмест адукацыі практычна на ўсіх узроўнях характарызуецца, з аднаго боку, перагружанасьцю навучальных праграмаў празьмернай, шмат у чым перастарэлай інфармацыяй, а з другога боку — прынцыповай адсутнасьцю сапраўды актуальнай інфармацыі, якая да таго ж была б яшчэ і добра пададзеная. Такая сытуацыя ў пэўным сэнсе абсалютна «натуральная» для адукацыйнай сыстэмы, бо ўсё беларускае грамадзтва «завісла» на першай стадыі свайго посткаляніяльнага існаваньня.

Хоць на пачатку 1990-х гг. і ажыцьцяўлялася своеасаблівая «дэканструкцыя» масыву навучальнага матэрыялу папярэдняй эпохі і хоць той час і спарадзіў

актыўную хвалю выданьняў навучальных дапаможнікаў беларускіх аўтараў (перадусім у гуманітарных дысцыплінах), парадокс быў у тым, што падручнікі новага пакаленьня ствараліся людзьмі старой школы, практычна незнаёмымі з найноўшымі гуманітарнымі дасьледаваньнямі. Такія аўтары насамрэч адтваралі ў сваіх тэкстах структуры мысьленьня квазімарксісцкага ўзору.

Інэртнасьць мысьленьня, адсутнасьць рэальных стымулаў прафэсійнага росту, закрытая клянава-карпарацыйная тактыка разьмеркаваньня выгадных замоваў на напісаньне падручнікаў, адсутнасьць іх адэкватнай навуковай экспэртызы выклікалі існую сёньня сытуацыю: у сфэры інфармацыйнага забесьпячэньня навуковай дзейнасьці пераважае «інфармацыйны шум».

Фармальна рынак навучальнай літаратуры насычаны, аднак рэальна сапраўды беларускіх падручнікаў новага пакаленьня для цэлага шэрагу дысцыплінаў (ад агульнага курсу філязофіі да сацыяльнай антрапалёгіі і культуралёгіі) няма. А шэраг сапраўды наватарскіх падручнікаў (найперш у гісторыі Беларусі) ня быў выдадзены дзеля актыўнага супрацьдзеяньня рэакцыйна настроеных экспэртаў.

Недэмакратычная і непразрыстая працэдура падрыхтоўкі падручнікаў, якая па-ранейшаму захоўваецца ў краіне, выключае адкрытую канкурэнцыю аўтарскіх калектываў і канцэпцыяў. Пры гэтым адсутнічаюць дыдактычныя парады для напісаньня падручнікаў. Інфармацыйнае асяродзьдзе мазаічнае, але не варыянтнае: у кожнай навучальнай установе, як правіла, навучаюць з «сваіх» дапаможнікаў. Гэта азначае, што ў краіне ня толькі адсутнічае неабходны звод базавых навучальных дапаможнікаў новага пакаленьня, адпаведных сучасным эўрапейскім стандартам, але і ўвогуле бракуе такіх дапаможнікаў.

«Шумавое» інфармацыйнае асяродзьдзе тутэйшай вытворчасьці стварае перадумовы для *расейскай інфармацыйнай экспансіі*. Расейскія падручнікі, нярэдка ня менш правінцыйныя зьместава, але з актуальным навуковым лексыконам і паўнейшым колам крыніцаў, актыўна заваёўваюць цэнтральнае месца на беларускім рынку інфармацыйна-адукацыйных рэсурсаў. У выніку беларускія навучэнцы атрымліваюць «два ў адным»: інфармацыйны пакет расейскай вытворчасьці ў камплекце з наборам сьветапоглядных установак былога Вялікага Брата.

Адукацыйныя тэхналёгіі гэтак жа дзіўна спалучаюць у сабе выразна акрэсьленую апошнім часам Міністэрствам адукацыі тэндэнцыю максымальнай стандартызацыі навучальных курсаў (міністэрствам уведзена адказнасьць за «няправільнае» паданьне матэрыялаў курсу) і хаатычнага экспэрымэнтаваньня, якое адбываецца ў прыватных навучальных установах усіх узроўняў. Фактычна існуе нібыта *плюралізм адукацыйных тэхналёгіяў:* у дзяржаўных установах практыкуюцца традыцыйныя мадэлі выкладаньня, а ў недзяржаўнай школе адбываецца стыхійная актыўнасьць энтузіястаў, якія спрабуюць засвоіць заходнія навучальныя тэхналёгіі.

Усе названыя падыходы найчасьцей малаадэкватныя рэальнай беларускай сытуацыі: літаральны перавод як з «савецкага», так і з «заходняга» тут абсалютна нядзейсны, а мэханізмы канструктыўнай адаптацыі пакуль ня выпрацаваныя. Такія «мазаічныя», ці «лапікавыя», навучальныя тэхналёгіі, якія канфліктуюць адна з адной ня толькі ў сьвядомасьці выкладчыка, але ў практыцы навучальных установаў, аб'ектыўна замінаюць эфэктыўнай камунікацыі ў працэсе навучаньня і істотна зьніжаюць ягоную якасьць. Выкладчык і навучэнцы ў найлепшым выпадку маюць няўцямнае ўяўленьне пра спосаб трансьляцыі і засваеньня матэрыялу. У найгоршым — проста гавораць на розных мовах, існуючы ў паралельных камунікацыйных прасторах.

Засваеньню найноўшых адукацыйных тэхналёгіяў замінае і існая практычна ў нязьменнай з савецкіх часоў форме сыстэма павышэньня кваліфікацыі. Ажыцьцяўляецца адкрытая дыскрымінацыя работнікаў недзяржаўнага сэктару адукацыі: для іх павышэньне кваліфікацыі ў дзяржаўных установах платнае. Нізкі ўзровень аплаты працы работнікаў інстытутаў павышэньня кваліфікацыі выклікае актыўны перацёк кадраў з сфэры «навучаньня навучаючых».

Інфармацыйная культура выкладчыцкага складу і навучэнцаў не адпавядае патрабаваньням сёньняшняга дня. Найперш гэта абумоўлена:

— слабым веданьнем замежных моваў (ды і роднай беларускай);
— масавай кампутарнай непісьменнасьцю;
— малой даступнасьцю сеткавых інфармацыйных рэсурсаў за межамі буйных гарадоў;

– нізкім тэхнічным (кампутарным) забесьпячэньнем абсалютнай бальшыні навучальных установаў.

Малаэфэктыўная сыстэма павышэньня кваліфікацыі настаўнікаў і выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх спэцыяльных навучальных установаў ня ў стане пераадолець разрыву паміж сучаснымі патрабаваньнямі да якасьці выкладаньня і ўзроўнем інфармацыйнай культуры выкладчыкаў і навучэнцаў, асабліва ў сфэры гуманітарных ведаў.

Ранейшае дзяржаўнай «разнарадкі» на абавязковую перападрыхтоўку выкладчыкаў навучальных установаў болей не існуе. Іншых стымулаў сучасная сыстэма беларускай адукацыі не прапануе, а таму кіраўніцтва навучальных установаў не зацікаўленае ў павышэньні якасьці выкладаньня і зь вялікім супрацівам адпраўляе супрацоўнікаў на перападрыхтоўку.

Тэматыка курсаў павышэньня кваліфікацыі фактычна не абнаўляецца, часьцяком носіць кан'юнктурны характар. Але нават калі сапраўды наватарская праграма інфармацыйнай перападрыхтоўкі ці дадатковай адукацыі рэалізуецца, яна непазьбежна прыходзіць у супярэчнасьць з рэальнымі ўмовамі работы правінцыйнага выкладчыка. Той ня мае ў дастатковай колькасьці ані адпаведных навучальных матэрыялаў, ані неабходнага кампутарнага абсталяваньня.

Гэткім чынам, сучасная беларуская школа ўсіх узроўняў занятая адтварэньнем альбо шаблённага набору «дазволеных» ведаў, альбо бессыстэмным камбінаваньнем пазычаных інфармацыйных і мэтадычных рэсурсаў. Адукацыйная інфармацыйная прастора прынцыпова неаднастайная і ўнутрана канфліктная. Усё гэта ёсьць адным з істотных фактараў росту крызысных тэндэнцыяў у беларускай сыстэме адукацыі.

Адтварэньне чалавечага рэсурсу функцыянаваньня грамадзтва

Беларуская сыстэма адукацыі, для якой адміністрацыйнае рэгуляваньне ёсьць галоўнай, калі не адзінай крыніцай функцыянаваньня і разьвіцьця, уяўляе сабой клясычны прыклад фабрычнай вытворчасьці «аднамернага чалавека» (Г. Маркузэ).

У характары свайго ўзьдзеяньня на навучэнцаў і пры ацэнцы пасьпяховасьці навучаньня яна захоўвае асноўныя рысы савецкай адукацыйнай сыстэмы:

– аўтарытарнасьць;
– адсутнасьць матывацыяў і рэальных магчымасьцяў для творчай працы як навучэнцаў, так і выкладчыкаў;
– ідэалягізаванасьць навучальнага працэсу;
– негарантаванасьць магчымасьці атрымліваць адукацыю на роднай мове як для тытульнай нацыі, так і для нацыянальных мяншыняў.

Мова навучаньня ў агульнаадукацыйных школах (у % ад агульнай колькасьці вучняў, сярэдняе значэньне па краіне)*



* Крыніца: Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтар Міністэрства адукацыі.

Мова навучаньня ў ВНУ (у тыс.чал.)*



* Крыніца: Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтар Міністэрства адукацыі.

Паводле свайго зьместу, сыстэма адукацыі (як у дзяржаўным, так і ў недзяржаўным фармаце) арыентавана на інфармацыйную «загрузку» навучэнцаў, а не на фармаваньне навыкаў творчай працы. Абнаўленьне кола крыніцаў, улучэньне ў іх лік тэкстаў на эўрапейскіх мовах, пераразьмеркаваньне навучальнага часу на карысьць самастойнай падрыхтоўкі, пісьмовыя формы бягучай справаздачнасьці — усё гэта аніяк не падмацавана навучаньнем тэхнікам аналітычнай работы і аўтарскага пісьма. Натуральнымі формамі самаабароны ад такіх «прагрэсіўных» адукацыйных навацыяў становяцца начотніцтва, сьпісваньне, прагулы і іншыя формы ціхага сабатажу.

Пры такой сыстэме запатрабаванымі якасьцямі «гатовага прадукту» аказваюцца не самастойнасьць мысьленьня і не разьвітая нацыянальная самасьвядомасьць, а якасьці супрацьлеглага кшталту — паслушэнства, ляяльнасьць, адданасьць кіраўніцтву. Рэальна гэта азначае прынцыповую *рэтраспэктыўную арыентацыю* адукацыйнага працэсу: ідзе выхаваньне не свабодных грамадзянаў незалежнай эўрапейскай дзяржавы, а баязьлівых канфармістаў, ваяроў для

няіснай імпэрыі. Мэнтальна гэта людзі ўчарашняга дня, якія прынцыпова няздольныя жыць ува ўмовах постіндустрыйнага грамадзтва.

Адсутнасьць выразных нацыянальных прыярытэтаў у адукацыйнай палітыцы выяўляецца і ў настойлівым імкненьні цалкам прывязаць беларускую сыстэму адукацыі да расейскай. Фактычна гэта значыць *ператварэньне айчыннай сыстэмы адукацыі ў ідэалягічны, інфармацыйны і сыстэмны прыдатак інстытутаў адукацыі суседняй краіны.*

У выніку навучальныя ўстановы Беларусі ствараюць альбо патэнцыйных інтэлектуальных эмігрантаў — працоўныя кадры для Расеі, альбо проста рэпрадукуюць чалавечы рэсурс для захаваньня беларускага *status quo*. У абодвух выпадках сыстэма адукацыі аб'ектыўна судзеіць «зачыстцы» культурнай прасторы ад патэнцыйных рэфарматараў — творча настроеных інтэлектуалаў з эўрапейскай сыстэмай вартасьцяў.

Гаворачы пра адтварэньне адукацыйнай сыстэмай пэўнага тыпу сацыяльнасьці, варта асобна адзначыць *зьніжэньне прэстыжнасьці выкладчыцкай працы.* Рэзкае падзеньне ўзроўню жыцьця выкладчыкаў у сярэдзіне 1990-х гг. выклікала рэзкае расслаеньне гэтай некалі заможнай «праслойкі». Пасьля адтоку найбольш актыўных і прадпрымальных выкладчыкаў у камэрцыйныя структуры і недзяржаўныя ВНУ выкладчыцкі корпус падзяліўся на функцыянэраў, якія маюць доступ да афіцыйных і «ценявых» рэсурсаў, актыўных «шматстаночнікаў», якія сумяшчаюць працу адразу ў некалькіх навучальных установах, і дэпрэсіўна настроеных «прыгонных», дзеля свайго веку ці характару няздольных увайсьці ў першыя дзьве групы.

Такім чынам, у адукацыйнай сыстэме краіны адбываюцца вельмі неадназначныя працэсы. З аднаго боку, гэта стыхійны працэс дыфэрэнцыяцыі сьветапоглядных арыентацыяў і адукацыйнага ўзроўню навучэнцаў, прынцыповы плюралізм іх жыцьцёвых стыляў і сцэнароў паводзінаў. З другога боку, падобная дыфэрэнцыяцыя адбываецца і ў выкладчыцкім асяродзьдзі: узьнікаюць своеасаблівыя «субкультуры» ў дыяпазоне ад кіруючай эліты, якая пасьпяхова сумяшчае адукацыйную і камэрцыйную дзейнасьць, да «інтэлектуальных валацугаў», якія вандруюць ад ВНУ да ВНУ ў пошуках дадатковага заробку. Пры гэтым існыя мадэлі і стандарты адукацыі адтвараюць звыклую аднароднасьць навучальнага працэсу.

Цяперашнія формы адукацыйнай актыўнасьці ня могуць забясьпечыць новым пакаленьням беларусаў ні «таварнай прывабнасьці» атрыманай імі адукацыі на эўрапейскіх рынках працы, ні разуменьня стратэгіяў індывідуальнага выжываньня ў постсавецкіх рэаліях, ні мажлівасьці ўстойлівай нацыянальнай і культурнай самаідэнтыфікацыі. З гэтага вынікае: адукацыйная сыстэма Беларусі ў яе актуальным выглядзе ня здольная выканаць функцыю расшыранага адтварэньня чалавечых рэсурсаў беларускай нацыі.

Крыніца фармаваньня новых нацыянальных элітаў

Сыстэма адукацыі якой-любя краіны ёсьць крыніцай фармаваньня і абнаўленьня нацыянальных элітаў. Яна мае выхоўваць людзей, якія спалучаюць прафэсійную падрыхтоўку высокай клясы, агульную культуру, валоданьне тэхналёгіямі прыняцьця рашэньняў і кіраваньня на ўсіх узроўнях, ад лякальнага да агульнанацыянальнага.

Сучасная адукацыйная сыстэма няздольная забясьпечыць эфэктыўнага адтварэньня нацыянальных элітаў. Прычыны гэтага ў жорсткай адміністрацыйнай палітыцы, стандартызацыі навучаньня пры страце якасьці, падмене эфэктыўных міжнародных кантактаў дэкарацыйнымі зносінамі, «інфармацыйным шуме» замест якаснага інфармацыйнага забесьпячэньня навучальнага працэсу, падмене мысьленьня веданьнем, кепскім валоданьні найноўшымі адукацыйнымі тэхналёгіямі, нізкай інфармацыйнай культуры, неразьвітай матэрыяльнай базе.

У той жа час, прычыны, зьвязаныя беспасярэдне з сфэрай адукацыі, яўна недастатковыя для разуменьня існай сытуацыі. Самі беларускія эліты не зацікаўленыя ўва ўласным абнаўленьні. Гэта абумоўлена найперш традыцыйным кланавым уладкаваньнем найвышэйшых эшалёнаў беларускага грамадзтва, арыентаваных у першую чаргу на захаваньне ўласных кіраўнічых пазыцыяў. У грамадзтве, у якім адсутнічае культура і рэальныя мэханізмы дэмакратычнай ратацыі, уладныя эліты кіруюцца не нацыянальнымі інтарэсамі, а інстынктам самазахаваньня. У краіне ніколі не існавала нармальнай дынамікі зьмены пакаленьняў элітаў. Адсутнічае і натуральная для разьвіцьця дзяржавы вытворчасьць працоўных месцаў у сфэры кіраваньня. То бок кожнае новае пакаленьне атрымлівае шанец рэалізаваць уласны

кар'ерны рост толькі праз канфлікт — «выбіваньне» старых кадраў з занятых пазыцыяў.

У гэтым сэнсе прынцыпова важнымі становяцца таленты інтрыганцтва і брудных закулісных гульняў, «правільнага» хабарніцтва і дакладнага ўлоўліваньня штохвілінна зьменлівага балянсу канфліктуючых сілаў, уменьне своечасова падыграць лідэру і знайсьці кампрамат на канкурэнта, г. зн. якасьці, наўпрост не зьвязаныя з адукацыяй. У найвышэйшых палітычных колах запатрабаваныя мадэлі паводзінаў кшталту «правінцыйны харызматык» і «асьцярожны інтрыган»; сярэднія слаі намэнклятурнай эліты актыўна імпартуюцца з правінцыі праз прынцып асабістай адданасьці.

У гэтых умовах новыя эліты («новыя беларусы», якія ўтойваюць даходы і вывозяць капітал за мяжу, новая рэклямная і мэдыяэліта і г. д.) існуюць альбо ў сукрытай, няяўнай форме, альбо «ўрастаюць» у існыя ўладныя структуры. Фармаваньне новых элітаў і іх зьяўленьне празь ясныя дэмакратычныя працэдуры супярэчыць інтарэсам улады, якая манапольна рэгулюе грамадзкі рух. Да таго ж іх зьяўленьне блякуецца «саўковымі» ўстаноўкамі часткі беларускага насельніцтва. Новыя «актыўныя меншасьці» ня маюць рэальнай прасторы для сваёй легітымізацыі, што запавольвае працэс іх афармленьня і выклікае актыўны «экспарт мазгоў» у памежныя краіны.

З вышэйсказанага вынікае, што ў сучаснай Беларусі адсутнічае натуральная для нармальнага «адкрытага грамадзтва» (К. Попэр) дынаміка абнаўленьня і росту нацыянальных элітаў. У выніку адбываецца крызыс самаідэнтыфікацыі беларускага грамадзтва. Наяўныя «эліты ўчарашняга дня» няздольныя ні глыбока адрэфлексаваць сацыяльныя працэсы, ні распрацаваць эфэктыўныя сцэнары грамадзкага разьвіцьця, ні забясьпечыць іх адэкватную рэалізацыю. Адзін з істотных фактараў замацаваньня агульнай сацыяльнай стагнацыі — адсутнасьць разьвітай сыстэмы элітарнай адукацыі, здольнай забясьпечыць рэгулярную даставу высокакваліфікаваных кадраў на вышэйшыя пятры сацыяльнай структуры.

Навукова-дасьледчая дзейнасьць

Традыцыйным складнікам сыстэмы адукацыі (найперш у сфэры вышэйшай школы) зьяўляецца навукова-дасьледчая актыўнасьць яе супрацоўнікаў. Спалучэньне выкладчыцкай і дасьледчай актыўнасьці дае магчымасьць практычнай «апрабаты» новых навуковых здабыткаў, атрыманых у працэсе выкладаньня.

Цяперашняя сытуацыя ў адукацыйнай сыстэме Беларусі (асабліва ў сыстэме выкладаньня дысцыплінаў гуманітарнага цыклю) не стварае рэальных матывацыяў для эфэктыўнай навуковай працы. Найперш гэта зьвязана з уставічнай перагрузкай выкладчыкаў: празьмерным аб'ёмам аўдыторных заняткаў, вельмі складанай сыстэмай справаздачнасьці, неабходнасьцю дзеля годнага заробку шукаць дадатковую працу. Разнастайныя гаспадарчаразьліковыя работы (за выняткам ідэалягічных замоваў) аплачваюцца вельмі кепска і найчасьцей ня маюць рэальнага выкарыстаньня, асядаюць на паліцах архіваў у выглядзе бясконцых «справаздачаў аб праведзенай працы». Выкананьне так званых плянавых тэмаў зводзіцца пераважна да хаатычных дасьледчых высілкаў навуковых супрацоўнікаў.

Падзеньне накладаў навуковай спэцыяльнай літаратуры, скарачэньне апошнімі гадамі колькасьці міжнародных кантактаў, відавочна дэкарацыйны характар разнастайных сэмінараў, чытаньняў і канфэрэнцыяў, дзяржаўнае фінансаваньне навукі (у тым ліку і на базе ВНУ) паводле рэшткавага прынцыпу, мінімальны адсотак камэрцыйных замоваў у агульнай колькасьці навуковых працаў ВНУ, адсутнасьць за апошнія гады заўважных прарываў і дасягненьняў выкладчыкаў ВНУ надаюць такім навуковым дасьледаваньням усё больш маргінальны характар. Навука на базе ВНУ стаецца справай альбо графаманаў, альбо энтузіястаў, альбо чыноўнікаў ад навукі, якія бясконцымі сустрэчамі актыўна асвойваюць «адукацыйны турызм».

Істотны аспэкт крызысу навукі пры ВНУ — адсутнасьць матэрыяльнай базы для дасьледчай працы. Тут варта адзначыць як недастатковую тэхнічную забясьпечанасьць (асабліва гэта тычыцца пэрыфэрыйных ВНУ), так і адсутнасьць пэрыядычнага абнаўленьня кніжных фондаў і электронных базаў дадзеных.

Творчыя групы дасьледнікаў ня маюць магчымасьці працаваць на камэрцыйнай аснове і самастойна распараджацца зароблены мі сродкамі, укладаць іх у пашырэньне дасьледаваньняў.

Павышэньню дасьледчага патэнцыялу ВНУ замінае і існая сыстэма наданьня навуковых ступеняў і годнасьцяў. Павышэньне ўзросту дактарантаў, а таксама адчувальнае скарачэньне колькасьці асьпірантаў і спаборнікаў выклікана адсутнасьцю пэрспэктываў паляпшэньня іх прафэсійнага статусу і якасьці жыцьця. Распаўсюджанае ў навуковым асяродзьдзі нежаданьне марнаваць некалькі гадоў на аўтарскае навуковае дасьледаваньне для атрыманьня кандыдацкай ці доктарскай ступені абумоўлена і яўна агрэсіўнымі паводзінамі Вышэйшай атэстацыйнай камісіі, якая неаднакроць «зарэзвала» сапраўды наватарскія і арыгінальныя працы. Абараніць дысэртацыю ў Маскве ці Санкт-Пецярбургу значна лягчэй, чым у родным Менску. Такая сытуацыя выклікае скарачэньне колькасьці творча актыўных дактароў і кандыдатаў навук: старэйшыя пакаленьні сыходзяць з навуковай сцэны, новыя ў навуку не ідуць. У выніку адбываецца ўсерадненьне ўзроўню выкладаньня і навуковай працы.

Дактары навук і прафэсары ў % ад агульнай колькасьці асноўнага штатнага пэрсаналу ВНУ*



* Крыніца: Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтар Міністэрства адукацыі РБ.

Галоўным зьвяном сыстэмы адукацыі дзеля аб'ектыўных прычынаў становіцца не актыўная моладзь, а канфармісты старэйшага веку — часьцяком былыя ідэалягічныя работнікі, якія здабылі ў свой час навуковую ступень за працы з навуковага камунізму ці з марксісцка-ленінскай філязофіі.

Існая сыстэма навукова-пэдагагічных годнасьцяў не адпавядае эўрапейскім стандартам, а іх наданьне, у адрозьненьне ад эўрапейскай практыкі, жорстка цэнтралізаванае.

Кандыдаты навук і дацэнты ў % ад агульнай колькасьці асноўнага штатнага пэрсаналу ВНУ*



* Крыніца: Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтар Міністэрства адукацыі РБ.

Дадатковым абмежаваньнем дасьледчай актыўнасьці работнікаў сыстэмы адукацыі становіцца рост стандартызацыі ў адукацыі і павышэньне кантролю за «правільнасьцю» вядзеньня навучальнага працэсу. Патрабаваньне ад супрацоўніка «кананічнага» выкананьня сваіх прафэсійных абавязкаў, насьцярожана-крытычнае стаўленьне да любой навацыі і экспэрымэнту, відавочна, несумяшчальныя з творчай самарэалізацыяй выкладчыка.

Наяўная сыстэма штогодняй атэстацыі супрацоўнікаў ВНУ наўпрост ня зьвязвае іх навуковую прадукцыйнасьць з матэрыяльным стымуляваньнем і кар'ерным

ростам. Актыўны дасьледчык-гуманітар з ВНУ займаецца навукай у аўтаномным рэжыме, на свае страх і рызыку. Пасыўны – імітуе творчы парыў, працуе як кампілятар. І той, і іншы ў творчым пляне існуюць пазасыстэмна, вырашаючы свае заданьні ў межах адукацыйных цыкляў. З гэтага вынікае, што тэрмін «навуковая супольнасьць» адносна вышэйшай школы можна выкарыстоўваць толькі ўмоўна. Рэальна існуе пэўная карпарацыйная супольнасьць, пазбаўленая ўстойлівых унутраных стымулаў да творчага росту і павышэньня дасьледчага патэнцыялу. На ўзроўні сыстэмы працуюць толькі вонкавыя стымулы – дзяржаўная замова, сумесныя праграмы ў рамках СНД, заходнія гранты. Крэацыйнасьць падмяняецца справаздачнасьцю, навуковы пошук – імкненьнем згадаць жаданьне замоўцы. З «фабрыкаў думкі», лябараторыяў інтэлектуальнага пошуку ВНУ ператвараюцца ў «фабрыкі сэрвісу», дэманструючы ў якасьці сваёй галоўнай вартасьці сэрвільнасьць, то бок мастацтва лёкайства.

Сыстэма кіраваньня і самакіраваньня*

У артыкуле 44 Закону «Аб адукацыі» 2002 г. дэкляруецца дзяржаўна-грамадзкі прынцып кіраваньня ў сфэры адукацыі. Аднак гэты прынцып фактычна скасоўваецца працэдурай стварэньня органаў самакіраваньня (да якіх чамусьці адносяцца толькі рады і апякунскія рады): «Палажэньне аб органах самакіраваньня павінна зацьвярджаць Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусі»[12]. Тым самым дзяржавай блякуецца стварэньне сапраўды грамадзкага мэханізму кіраваньня адукацыяй і забясьпечваецца ягоная поўная падкантрольнасьць.

Адукацыйная сыстэма Беларусі застаецца цэнтралізаванай і непадкантрольнай грамадзтву. Згорненыя рэформы, пачатыя пасьля абвяшчэньня незалежнасьці краіны. Актуальныя кірункі афіцыйных рэфарматарскіх высілкаў скіраваны на стварэньне структуры 12-гадовага школьнага навучаньня, пераход школы на 5-дзённы навучальны тыдзень, увядзеньне ў навучальных установах 10-балавай сыстэмы, а ў вышэйшых навучальных установах – шматузроўневай (шматпры-

* Падразьдзел напісаны пры ўдзеле Сьвятланы Крупнік і Ўладзімера Мацкевіча.

[12] Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтар Міністэрства адукацыі (www. cacedu.unibel.by/Education).

ступкавай) сыстэмы навучаньня (бакаляўр — 4 гады, спэцыяліст — 5 гадоў, магістар — 6 гадоў).

Усе гэты навацыі аніяк не закранаюць сыстэмы кіраваньня адукацыяй.

Заканадаўства, якое рэглямэнтуе адукацыйную дзейнасьць, анахранічнае, «новыя» заканадаўчыя распрацоўкі адтвараюць базавыя прынцыпы камандна-адміністрацыйнай сыстэмы ў адукацыі. У новай вэрсіі закону аб адукацыі выкрасьлены артыкул аб гаспадарчай дзейнасьці навучальных установаў, скасаваная падначаленасьць Міністэрства адукацыі парлямэнту, надзвычай невыразна вытлумачана ідэя акадэмічных свабодаў вышэйшых навучальных установаў. Заканадаўча блякуецца правядзеньне рэальных рэформаў у адукацыйнай сфэры.

Новы закон замацоўвае савецкую клясыфікацыю ступеняў адукацыі (сярэдняя спэцыяльная, прафэсіянальна-тэхнічная і г. д.) і ліквідуе інстытут экстэрнату. У ім адсутнічае юрыдычнае афармленьне такой формы навучаньня, як магістратура. Прапісаная ў ім тыпалёгія навучальных установаў не адпавядае эўрапейскім стандартам і не забясьпечвае сапраўднай пераемнасьці і тэхналягічнасьці адукацыі.

Сыстэма кіраваньня адукацыяй выбудавана паводле прынцыпу вэртыкалі ўлады і ня мае зваротнай сувязі. Яе структура мае такія элемэнты, як «рана», «гарана» і «аблана», што выконваюць кантрольна-ідэалягічныя функцыі, а не экспэртна-мэтадычныя. У той жа час цяперашняя сыстэма не прадугледжвае элемэнтаў самакіраваньня ў працы навучальных установаў. Такі панятак, як «акадэмічныя свабоды», для бальшыні кіраўнікоў навучальных установаў паранейшаму застаецца незразумелым і бессэнсоўным.

Скрайняя цэнтралізаванасьць адукацыйнай сыстэмы, яе закрытасьць і непразрыстасьць для грамадзтва (у спалучэньні з афармленьнем аўтарытарнай адукацыйнай эліты на ўзор палітычнай) ствараюць спрыяльныя ўмовы для росту карупцыі ў сфэры адукацыі, пашырэньня ўсялякіх пабораў пад выглядам «платных паслугаў» і «добраахвотных ахвяраваньняў», росту ценявой адукацыі. Асабліва апошнім часам разьвілася практыка «сьпісавага» паступленьня ў ВНУ, калі дэканат пэўнай ВНУ складае сьпіс абітурыентаў, якія павінны паступіць, нягледзячы ні на што. Пашыраюцца таксама формы гандлю экзамэнацыйнымі

адзнакамі і дыплёмамі, розныя віды простай і сукрытай «падтрымкі» падчас навучаньня, пераразьмеркаваньне кіраўніцтвам навучальных установаў фінансавых паступленьняў на сваю карысьць. Наагул можна казаць пра імклівы рост карумпаванасьці вышэйшай школы.

Імкненьне дзяржавы забясьпечыць поўны кантроль над усімі формамі адукацыйнай дзейнасьці выяўляецца ў дыскрымінацыі недзяржаўных адукацыйных ініцыятываў (адмова ў выдачы ліцэнзіяў, уставічныя фінансавыя праверкі, праблемы з арэндай навучальных плошчаў і г. д.). Заданьне такой актыўнасьці зразумелае: абмежаваць колькасьць і сфэру ўплыву недзяржаўных навучальных установаў.

У той жа час на пачатку 1990-х гг. узьнік шэраг прыватных адукацыйных праектаў, якія спалучылі новыя «рынкавыя» мэханізмы і інтарэсы «новай старой» адукацыйнай намэнклятуры (Эўрапейскі гуманітарны ўнівэрсытэт, Інстытут парлямэнтарызму і прадпрымальніцтва, Інстытут сучасных ведаў і г. д.). Тым самым адбывалася афармленьне рынку адукацыйных паслугаў, паўставала канкурэнцыя навучальных установаў. Замест сумленнай канкурэнцыі дзяржаўны сэктар аддае, аднак, перавагу адміністрацыйнаму прэсінгу «суперніка».

Колькасьць ВНУ*



* Крыніца: Галоўны інфармацыйна-аналітычны цэнтар Міністэрства адукацыі.

«Недарэфармаванасьць» сыстэмы адукацыі выяўляецца ў супярэчлівым суіснаваньні ў адзінай адукацыйнай прасторы навучальных установаў і навукова-мэтадычных органаў розных пакаленьняў — «савецкіх» ПТВ і сярэдніх школаў, «заходніх» гімназіяў і каледжаў, традыцыйных інстытутаў падвышэньня кваліфікацыі і новых школаў маркетынгу і мэнэджмэнту, Рэспубліканскага інстытуту вышэйшай школы і незалежных аналітычных групаў. Як вынік, існуе дубляваньне функцыяў і адсутнасьць адзіных прыярытэтаў. Сыстэма адукацыі перагружаная і патрабуе ачышчэньня ад малаэфэктыўных складнікаў. Існуе неабходнасьць аднаўленьня рэальнай сыстэмнасьці, г. зн. забесьпячэньня ўнутранай цэльнасьці, празрыстасьці і сумернасьці ўсіх формаў адукацыйнай дзейнасьці.

Наяўная сыстэма адукацыі фактычна ня мае спэцыяльна падрыхтаваных кіраўнічых кадраў усіх узроўняў. «Мэнэджмэнт у сфэры адукацыі» — гэта яшчэ не запоўненая ніша, бо ў краіне не існуе ні навучальных установаў з такой спэцыялізацыяй, ні практыкі кваліфікаванага адбору пры заняцьці кіраўнічых пасадаў. Арганізацыйна-кіраўнічай працай занятыя не прафэсіяналы, а альбо кар'ерысты (арыентаваныя на дасягненьне ўласнага дабрабыту абы-дзе і абы-як), альбо «свае людзі» (асабіста адданыя начальству і без сваёй уласнай думкі), альбо аўтсайдэры прафэсійнай супольнасьці. Так ці іначай, выпадковы чалавек на месцы кіраўніка сыстэмы адукацыі ня здольны прымусіць яе эфэктыўна працаваць.

Рост апошнім часам камэрцыйнай актыўнасьці навучальных установаў адлюстроўвае, як правіла, не рэальныя патрэбы ўстановаў, а ўзровень амбіцыяў іх кіраўніцтва. Камэрцыйныя праекты маюць пераважна факультатыўны адносна навучальнага працэсу характар, рэальна не прыцягваюць сродкі, а выбудоўваюць «паралельны бюджэт» канкрэтнай установы. Прыкладам можа быць разнаплянавая камэрцыйная актыўнасьць Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту — ад конкурсаў прыгажосьці да радыё Unistar. Пры гэтым стан матэрыяльнай базы, забясьпечанасьць працэсу навучаньня інфармацыйнымі рэсурсамі новага пакаленьня і ўзровень аплаты супрацоўнікаў БДУ застаюцца абсалютна неадпаведнымі статусу «першай ВНУ краіны».

Прынятая сыстэма статыстычнай справаздачнасьці ў сфэры адукацыі не адлюстроўвае базавых паказьнікаў стану і разьвіцьця сыстэмы адукацыі.

Адсутнічае дакладнае ўяўленьне аб нормах навучальнай нагрузкі. Прынятыя на сёньня нормы, як для выкладчыкаў (550 аўдыторных заняткаў для ВНУ замест 150 у ЗША), так і для студэнтаў, завышаныя і супярэчаць эўрапейскім стандартам, што выклікае агульнае паніжэньне якасьці навучальнай працы. Суадносіны колькасьці выкладчыкаў і студэнтаў таксама не адпавядаюць прынятым эўрапейскім стандартам, што дазваляе казаць пра стратны характар беларускай сыстэмы адукацыі. У гэтым выпадку йдзецца і пра неэфэктыўную кадравую палітыку: штаты празьмерна разьдзьмутыя, ацэнка працы ўсярэдненая й не адпавядае рэальнаму ўнёску супрацоўніка, адсутнічае эфэктыўная стымуляцыя творчай актыўнасьці.

Сучаснай сыстэме кіраваньня адукацыяй уласьціва спалучэньне дэманстрацыйнай бюракратычнай актыўнасьці, імправізацыйна-аўтарытарнага стылю кіраваньня, марнаваньня і без таго нязначных сродкаў зь дзяржаўнага бюджэту і хаатычнага эканамічнага (камэрцыйнага) экспэрымэнтаваньня. Фактычна сучаснае кіраваньне беларускай адукацыяй ня здольнае забясьпечыць эфэктыўнага функцыянаваньня і разьвіцьця сыстэмы. Наяўныя кіраўнічыя кадры, дзеючы ў рамках жорсткай дзяржаўнай палітыкі, здольны забясьпечыць у найлепшым выпадку толькі выжываньне канкрэтнай навучальнай установы, але не яе якасны рост. Сыстэма адукацыі выяўляецца неэфэктыўнай ня толькі ў інфармацыйна-мэтадычным, але і ў кіраўніча-эканамічным пляне.

Высновы

Беларускай адукацыі ўласьцівы *ўсебаковы крызыс*. Замест інфармацыйнага забесьпячэньня яна трансьлюе «інфармацыйны шум», замест творча думаючай «будучыні нацыі» прадукуе канфармістаў ці інтэлектуальных эмігрантаў, замест новых элітаў тыражуе чыноўніцкія кадры, расьцярушвае і люмпэнізуе выкладчыкаў. Неэфэктыўнасьць беларускай адукацыі палягае ня толькі ў нізкай якасьці выніковага прадукту, але і ў прынцыповай няздольнасьці яе кіраўнічых структураў арганізаваць эфэктыўную работу грувасткай і шмат у чым застарэлай сыстэмы. Застарэлыя адукацыйныя мэханізмы працягваюць ствараць «людзей учарашняга дня».

4

Выклікі і матывацыі

Максім Жбанкоў, Аляксандар Палоньнікаў

Кансэрвацыя цяперашняга стану сыстэмы адукацыі Беларусі азначае ня проста падзеньне якасьці адукацыі і яе «правінцыялізацыю». Нерэфармаванасьць сыстэмы адукацыі непазьбежна адаб'ецца на стане беларускага грамадзтва і прывядзе да шэрагу вельмі адчувальных наступстваў, што выходзяць за рамкі ўласна адукацыйнай сыстэмы.

Нэгатыўныя матывацыі рэформаў

Цяперашнія кансэрвацыйна-рэтраспэктыўныя арыентацыі і імпартаваньне разам зь ненайлепшымі адукацыйнымі мадэлямі постсавецкіх і постімпэрскіх комплексаў з Расеі здольныя абвастрыць у пэрспэктыве наяўны канфлікт кіруючых каляніяльных элітаў і нацыянальнай культуры, а таксама кіруючых элітаў і новых пакаленьняў беларусаў. Гэта будзе азначаць разбурэньне натуральных для кожнай краіны мэханізмаў адтварэньня культурных арыентацыяў на ўласныя нацыянальныя інтарэсы. У выніку адбудзецца паглыбленьне крызысу самаідэнтыфікацыі беларускай нацыі, якую пазбавяць ня толькі гістарычнай памяці, але і гістарычнай пэрспэктывы. Да таго ж цяперашнія кансэрвацыйна-рэтраспэктыўныя арыентацыі стрымліваюць працэсы сацыяльнай мадэрнізацыі беларускага грамадзтва і не спрыяюць фармаваньню новых мадэляў сацыяльнай мабільнасьці.

Аўтарытарная сыстэма адукацыі тыражуе канфармісцкую сьвядомасьць і гэтым блякуе працэсы фармаваньня нацыянальных элітаў новага пакаленьня,

а таксама грамадзянскай супольнасьці. У пэрспэктыве гэта азначае ператварэньне Беларусі ў тыповую краіну трэцяга сьвету — пастаўніцу некваліфікаванай працоўнай сілы для разьвітых суседзяў.

Арыентацыя на расейскія адукацыйныя тэхналёгіі, навучальныя стандарты і інфармацыйныя рэсурсы фармуе асымэтрычную культурнасьць каляніяльнага тыпу, спараджаючы ня толькі інфармацыйную, але і ідэалягічную залежнасьць ад былой мэтраполіі. У супрацьвагу працэсам выпрацоўкі нацыянальнай ідэнтычнасьці і грамадзянскай сьвядомасьці сыстэма дзяржаўнай адукацыі ў яе ранейшым выглядзе будзе адтвараць «тутэйшую» мэнтальнасьць, заснаваную на ідэі ўласнай «нікчэмнасьці» і, як вынік, гатоўнасьці выконваць чарговую каманду носьбітаў «вялікай» (= чужой) культуры.

Нежаданьне і няўменьне прывесьці адукацыйную сыстэму ў адпаведнасьць з эўрапейскімі стандартамі непазьбежна выклічуць рост культурнага адставаньня — падзеньне ўзроўню функцыянальнай пісьменнасьці і агульнай адукаванасьці. У пэрспэктыве гэта азначае рэзкае падзеньне агульнага ўзроўню выкладаньня і далейшую дэвальвацыю значнасьці адукацыі ў вачох як беларусаў (адсутнасьць рэальнай сувязі паміж адукаванасьцю і сацыяльнай пасьпяховасьцю), так і эўрапейскай супольнасьці (прынцыповая неканвэртаванасьць беларускай вышэйшай адукацыі). У гэтым выпадку адбудзецца *гетаізацыя беларускай адукацыі*.

Непрыняцьце сучасных адукацыйных тэхналёгіяў, адсутнасьць матэрыяльнай базы для эфэктыўнага адукацыйнага працэсу, выраджэньне сыстэмы пасьлядыплёмнай адукацыі і перападрыхтоўкі ператвораць краіну неканвэртаваных дыплёмаў у неканвэртаваную краіну — другасны соцыюм, які ня мае цікавасьці для міжнароднай супольнасьці ні як палітычны хаўрусьнік, ні як эканамічны партнэр, ні як суб'ект культурнага супрацоўніцтва.

Захаваньне цяперашняй сыстэмы адукацыі ў будучым непазьбежна абвострыць існую супярэчнасьць паміж рэальнымі тэндэнцыямі сацыяльнай дынамікі і наборам дэкляраваных у рамках навучальнага працэсу вартасьцяў і жыцьцёвых прыярытэтаў. Гэта будзе выяўляцца ў павелічэньні «культурнай шызафрэніі» — страце адзінства нацыянальнай культуры і нацыянальнай ідэнтычнасьці. Гэта выкліча, з аднаго боку, масавы стыхійны пошук новых сьветапоглядных арыен-

тацыяў (уключаючы самыя радыкальныя і сацыяльна небясьпечныя формы), з другога — татальную міталягізацыю зьместу адукацыі, якая канчаткова згубіла сувязь з жыцьцём.

Калі ж сыстэма адукацыі Беларусі і надалей будзе некрытычна капіяваць разнастайныя ўзоры адукацыйных практыкаў, не ствараючы сваіх уласных, і цалкам адмовіцца ад арыентацыі на ўласную культурную традыцыю, яе чакае распад і паглынаньне.

Гэткім чынам, кансэрвацыя беларускай сыстэмы адукацыі ў яе сёньняшнім выглядзе вядзе не да забесьпячэньня стабільнасьці грамадзтва, а да абвастрэньня культурнага крызысу. Аб'ектыўна гэта стварае рэальную пагрозу сацыяльна-палітычнаму, эканамічнаму і культурнаму разьвіцьцю беларускага грамадзтва.

Пазытыўныя матывацыі рэформаў

Дынамічнае ўзаемадзеяньне беларускай сыстэмы адукацыі з эўрапейскімі, а ня толькі расейскімі, адукацыйнымі практыкамі (выклік шматстайнасьці) інтэнсіфікуе працэсы культурнага самавызначэньня беларускай нацыі і будзе спрыяць адкрытасьці беларускага грамадзтва.

Калі гаварыць канкрэтней, рэформа адукацыі неабходная:

- дзеля аднаўленьня страчанай «сувязі часоў», культурнай традыцыі і гісторыі Беларусі ў нацыянальнай сьвядомасьці новых пакаленьняў, дзеля разьвіцьця нацыянальнай і грамадзянскай самасьвядомасьці;
- як сродак уключэньня беларускіх адукацыйных установаў у сыстэму эўрапейскай адукацыі. Гэта прынцыпова зьменіць ня толькі зьмест навучаньня і паданьне матэрыялу, але і зробіць беларускія дыплёмы канвэртаванымі, што дазволіць беларусам актыўна ўвайсьці на эўрапейскі рынак працы, пашырыць магчымасьці дзелавых і культурных кантактаў. Заканамерна павысіцца статус адукацыі як рэальнага спосабу творчай самарэалізацыі і кар'ернага росту;
- як сродак «абуджэньня» творчага мысьленьня ў новых пакаленьняў беларусаў. Замест грамадзтва канфармістаў неабходна будаваць грамадзтва людзей з творчым запалам, арыентаваных не на сьляпое выкананьне

«генэральнай лініі», а на індывідуальную самарэалізацыю ў сваёй краіне. Гэта мае выклікаць выбух культурных ініцыятываў, даць моцны стымул разьвіцьцю ўсіх сфэраў жыцьця грамадзтва;

– дзеля выхаваньня маладых амбітных інтэлектуалаў. Рэформа дазволіць ім ня толькі атрымаць (ці стварыць самім) годнае працоўнае месца на радзіме, але і зробіць іх рэальнымі аўтарамі «Праекту Беларусь» – тымі, хто будзе фактычна вызначаць заўтрашняе аблічча нашай краіны;
– дзеля фармаваньня рэальнай базы для росту грамадзянскай супольнасьці. Сыстэма адукацыі паклікана рыхтаваць свабодных грамадзянаў, здольных да сацыяльных пераўтварэньняў. Гэта ператворыць «электарат» у народ, здольны самастойна вызначаць свой лёс;
– дзеля паўставаньня сытуацыі канкурэнцыі адукацыйных паслугаў і розных адукацыйных практыкаў, што будзе спрыяць павышэньню якасьці адукацыі ў краіне і зробіць яе канкурэнтаздольнай на эўрапейскім і сусьветным рынку.

Натуральным вынікам рэалізацыі гэтых мэтаў стане вызваленьне ад пачуцьця культурнай непаўнавартаснасьці і ператварэньне Беларусі ў нармальную эўрапейскую краіну. Рэфармаваньне сыстэмы адукацыі ў нацыянальным рэчышчы непазьбежна прывядзе да разбурэньня каляніяльнай міталёгіі як на ўзроўні масавай сьвядомасьці, так і на ўзроўні палітычных адносінаў нацыянальных элітаў.

Мадэль рэформы адукацыйнай сыстэмы Беларусі

Сьвятлана Крупнік, Уладзімер Мацкевіч

4

Мэты й заданьні рэформы

Ажыцьцяўленьне нацыянальна арыентаванай адукацыйнай палітыкі, якая сьцьвярджае вартасьці незалежнасьці й сувэрэнітэту нашай краіны, вартасьці гістарычнай і культурнай спадчыны, магчымасьць і неабходнасьць дасягненьня высокіх сацыяльных стандартаў, здольнае кансалідаваць і натхніць беларусаў на пабудову эфэктыўнага грамадзтва.

Яшчэ Дж. Д'юі зазначаў, што найважнейшымі мэтамі адукацыі ёсьць: а) фармаваньне сацыяльнай эфэктыўнасьці асобы; б) далучэньне яе да культуры. Выклікі сучаснага постіндустрыйнага і інфармацыйнага грамадзтва, здавалася б, патрабуюць адназначнага прыярытэту першай з названых мэтаў. Але спэцыфіка беларускай сытуацыі палягае ў асаблівай вастрыні праблемы нацыянальна-культурнай самаідэнтыфікацыі, таму другая мэта павінна разглядацца як раўназначная першай.

Адным з заданьняў рэфармаваньня беларускай адукацыйнай сыстэмы мусіць стацца сьветапоглядна-інфармацыйнае забесьпячэньне фармаваньня беларускай культурна-нацыянальнай ідэнтычнасьці, выхаваньне самасьвядомасьці нацыі як падмурку сацыяльнага дзеяньня.

Асноўныя парамэтры рэфармаваньня адукацыі

Яны вынікаюць як з прыняцьця міжнародных стандартаў у галіне адукацыі, так і з спэцыфікі беларускай сытуацыі.

Выкананьне міжнародных абавязкаў у галіне адукацыі

Гэта азначае, што беларуская адукацыя мусіць перадусім разглядацца ў эўрапейскім кантэксьце і базавацца на прынцыпах і патрабаваньнях, сфармуляваных у шэрагу міжнародных дакумэнтаў. Вось толькі некаторыя зь іх:

- «Лісабонская канвэнцыя» аб прызнаньні кваліфікацыяў, што датычаць вышэйшай адукацыі ў эўрапейскім рэгіёне;
- «Балёнская дэклярацыя» 1999 г., „Magna Charta Universitatum" 1988 г.;
- праграмы (або іх нацыянальныя аналягі): COMET (узаемадзеяньне вышэйшай адукацыі і прамысловасьці), ERASMUS (распрацоўка ўзгодненых праграмаў і плянаў для ВНУ), LINYUA (масавае практычнае авалодваньне эўрапейскімі мовамі праз стажаваньне й практыку студэнтаў і выкладчыкаў у адпаведных краінах), TEMPUS (структурныя праблемы ўнівэрсытэтаў), SOKRATES (праблемы выхаваньня), LEONARDO (праблемы падрыхтоўкі);
- рэкамэндацыі міжнародных канфэрэнцыяў: Гамбург 1997 г. (Адукацыя для дарослых), Дакар 2000 г. (Адукацыя для ўсіх);
- стандарты ISO 9000:2000;
- сыстэма крэдытаў паводле аналёгіі з ECTS (European community course credit transfer system) і сумяшчальная зь ёй.

Гэтыя дакумэнты датычаць найперш сыстэмы вышэйшай адукацыі ў эўрапейскім рэгіёне, але прывядзеньне гэтай сыстэмы ў адпаведнасьць з патрабаваньнямі, што ўтрымліваюцца ў названых дакумэнтах, выступае крытэрам ацэнкі ніжэйшых узроўняў адукацыі (сярэдняй і далейшай), а таксама арыенцірам для рэфармаваньня ўсіх астатніх узроўняў адукацыі.

Нацыянальна-культурныя характарыстыкі

Уся адукацыя ў краіне мусіць быць беларускай. Гэтую тэзу ня варта разумець у аўтаркічным сэнсе. Гаворка не пра самаізаляцыю й правінцыйнасьць, а пра ўзгодненасьць мэтаў і вынікаў адукацыі з працэсам і заданьнем умацаваньня сувэрэнітэту Беларусі, станаўленьнем яе як новай самастойнай эўрапейскай дзяржавы. Адукацыя і выхаваньне мусяць быць патрыятычнымі, спрыяць захаваньню традыцыяў і гістарычнае спадчыны беларускага народу, культурнае самабытнасьці, адпавядаць нацыянальным інтарэсам, мацаваць нацыянальную ідэнтычнасьць асобы, спрыяць паўставаньню нацыі ў рамках трывалай грамадзянскай супольнасьці.

Сацыяльна-палітычныя характарыстыкі

Наўрад ці сыстэма адукацыі мусіць быць лідэрам дэмакратызацыі ў грамадзтве, але адставаньне ў дэмакратызацыі ў галіне адукацыі вядзе да таго, што і ў астатніх сфэрах грамадзкага жыцьця кансэрвуюцца недэмакратычныя формы стасункаў.

Вызваленьне ад таталітарнае спадчыны — працэс працяглы і хваравіты. Больш як дзесяцігадовы гістарычны досьвед (як у Беларусі, так і ў краінах з падобным гістарычным лёсам) паказвае, што наіўна чакаць хуткіх посьпехаў на шляху да пабудовы грамадзянскай супольнасьці, дэмакратыі і праўнай дзяржавы. Важныя не кароткачасовыя посьпехі на гэтым шляху, якія могуць зьмяняцца пэрыядамі рэстаўрацыі аўтарытарных і таталітарных адносінаў. Важны няўхільны прагрэс у гэтым кірунку. Лепш павольная, але ўстойлівая дэмакратызацыя, чым ківачападобныя рухі ад таталітарызму да дэмакратыі і назад.

Ад сыстэмы адукацыі можна, прынамсі, чакаць таго, каб пакаленьні выпускнікоў школаў усіх узроўняў папаўнялі не кансэрватыўна настроеныя слаі грамадзтва, не апатычных, патэрналісцка настроеных спажыўцоў, а шэрагі актыўных самастойных грамадзянаў, якія самі нясуць адказнасьць за сваё жыцьцё і самастойна вырашаюць (умеюць вырашаць) свае праблемы. Таму беларуская адукацыя мусіць быць агульнадаступнай. Прафэсійная падрыхтоўка мусіць

адпавядаць запатрабаваньням рынку працы. Выпускнікі школаў усіх узроўняў мусяць мець высокую імавернасьць знайсьці працу (мець адпаведную падрыхтоўку й кваліфікацыю) або працягнуць адукацыю (мець дзеля гэтага дастатковыя веды і быць кампэтэнтнымі).

Сацыяльныя пытаньні адукацыі мусяць зрабіцца прадметам цікавасьці палітычных партыяў і палітычных інстытутаў. Праграмы палітычных партыяў і перадвыбарныя праграмы асобных палітыкаў мусяць надзяляць больш увагі праблемам адукацыі, толькі тады сама адукацыя можа зрабіцца аб'ектам клопату шырокіх слаёў грамадзтва. І тады дзеяньні цэнтральнай і мясцовых уладаў у сфэры адукацыі будуць кантралявацца грамадзянскай супольнасьцю, а пытаньні адукацыі будуць вырашацца ў інтарэсах грамадзянаў Беларусі, як на нацыянальным узроўні, так і ў асобных рэгіёнах.

Эканамічныя характарыстыкі

Адукацыя можа быць бясплатнай у школах усіх узроўняў, але гэта зусім ня значыць таго, што яна нічога не каштуе. Спосабы фінансаваньня адукацыі мусяць быць сучаснымі і разумнымі. Кошт усёй сыстэмы адукацыі мусіць быць прымальны для нацыянальнага і мясцовых бюджэтаў.

Платныя адукацыйныя паслугі мусяць быць «па кішэні» сем'ям зь сярэднімі даходамі. Доля бюджэтных сродкаў на адукацыю, належных грамадзяніну Беларусі, мусіць вылучацца кожнаму на роўных умовах незалежна ад формы ўласнасьці навучальнай установы, у якой гэты грамадзянін жадае навучацца. Мэханізмы, якія гэта забясьпечваюць, павінны быць вядомыя і разнастайныя.

Выдаткі дзяржавы мусяць быць эканамічна мэтазгодныя. Гэта значыць, што выдаткаваныя грошы маюць акупляцца. Ня толькі праз рост ВУП, але і праз скарачэньне выдаткаў на ліквідацыю беспрацоўя, беднасьці, дзіцячай і моладзевай злачыннасьці, сацыяльнай неабароненасьці, некантраляванай міграцыі і г. д.

Выдаткі кожнага чалавека на адукацыю мусяць быць таксама эканамічна мэтазгодныя. У агульным выглядзе гэта значыць, што працягласьць навучаньня мае быць проста прапарцыйна зьвязаная з дасягнутым выпускніком сацыяльным статусам. То бок кожны дадатковы год, выдаткаваны на навучаньне, мусіць

даваць навучэнцу тыя ці іншыя эканамічныя перавагі: падвышэньне кошту ягонае працы й кваліфікацыі, падвышэньне канкурэнтаздольнасьці на рынку працы, падвышэньне сацыяльнай мабільнасьці і інш.

Кіраваньне сыстэмай адукацыі

Кіраваньне ўвогуле, і кіраваньне адукацыяй у прыватнасьці, заўсёды поліструктурнае. Рэформа сыстэмы кіраваньня адукацыяй прадугледжвае выкананьне шэрагу *прынцыпаў:*

– дэмакратызм, што прадугледжвае арганізацыю такой формы кіраваньня, пры якой дасягаецца максымальная магчымасьць знаходжаньня кампрамісаў паміж меншынёй і бальшынёй, а таксама паміж рознымі мяншынямі. Прынцып дэмакратызму адпавядае канцэпцыі «адкрытага грамадзтва». Датычна сыстэмы адукацыі гэты прынцып можа быць рэалізаваны, калі праўныя, канцэптуальныя і праектныя нормы разьвіцьця адукацыйнай дзейнасьці адлюстроўваюць ня толькі інтарэсы дзяржавы, але ўсіх суб'ектаў, зацікаўленых у разьвіцьці адукацыі;
– дзяржаўна-грамадзкі або грамадзка-дзяржаўны характар кіраваньня, што прадугледжвае ня гэтак першынство аднаго з фокусаў, як іх разумнае разьмеркаваньне ў вырашэньні праблемаў адукацыі.

У артыкуле 44 Закону «Аб адукацыі» 2002 г. толькі дэкляруецца дзяржаўна-грамадзкі прынцып кіраваньня ў сфэры адукацыі. Аднак фактычна гэты прынцып адкідаецца.

Рэформа сыстэмы кіраваньня адукацыяй мусіць пачынацца з стварэньня мэханізму дзяржаўна-грамадзкага кіраваньня праз скасаваньне існых заканадаўчых супярэчнасьцяў. Як гэта ні парадаксальна, але ініцыятарам стварэньня такога мэханізму можа стацца сама дзяржава, якая робіцца зацікаўленай у станаўленьні й фармаваньні грамадзкага фокусу кіраваньня. Магчымы варыянт, калі ініцыятарам гэтага працэсу робяцца органы грамадзкасьці. Апошнія могуць быць прадстаўленыя прафсаюзамі, асацыяцыямі, разнастайнымі фондамі, арганізацыямі і іншымі аб'яднаньнямі, што прэзэнтуюць інтарэсы суб'ектаў адукацыі і грамадзтва. Яны могуць выступаць у ролі замоўцы на рознага кшталту

экспэртызы, распрацоўку праўнага забесьпячэньня і мусяць валодаць правам заканадаўчай ініцыятывы. Рэалізацыю такога дзяржаўна-грамадзкага мэханізму можна пачаць з правядзеньня агульнанацыянальнай дзяржаўна-грамадзкай экспэртызы, якая б канстатавала стан якасьці адукаванасьці, падрыхтаванасьці і пісьменнасьці выпускнікоў навучальных установаў Беларусі, якасьці самога тэхналягічнага працэсу адукацыі, а таксама гуманітарных і маральных аспэктаў адукацыі. Вынікам працэсу ўзаемадзеяньня дзяржавы й грамадзкасьці мусяць стацца Мэмарандум і Дактрына разьвіцьця адукацыі ў Беларусі, прынятыя на пэрыяд рэформы.

Новая сыстэма кіраваньня адукацыяй мае вырашыць шэраг найскладанейшых заданьняў, уласьцівых для пераходнага пэрыяду:

- прыняцьце асноўных рамкавых законаў і нормаў, неабходных для рэфармаваньня;
- сумяшчэньне працэсаў разьвіцьця і працэсаў функцыянаваньня ў адукацыі;
- перавод сыстэмы адукацыі на прынцыпова новы зьмест адукацыі і новыя тэхналёгіі;
- фармаваньне новых структураў і тыпалёгіі навучальных установаў;
- стварэньне мэханізму кіраваньня якасьцю адукацыі;
- рэсурсавае забесьпячэньне сыстэмы адукацыі ўва ўмовах пераходу ад татальнай дзяржаўнай сыстэмы да рынку адукацыйных паслугаў.

У пэрыяды рэфармаваньня адукацыі сыстэма кіраваньня значна ўскладняецца. Ускладненьне палягае ў тым, што мусяць існаваць сталыя органы кіраваньня, якія кіруюць працэсам функцыянаваньня адукацыі, аднак павінны ствараццa і новыя часовыя структуры кіраваньня, якія кіруюць і адказваюць беспасярэдне за рэформу адукацыі або працэс разьвіцьця адукацыі, з паступовым перадаваньнем сваіх паўнамоцтваў і функцыяў стала дзейным органам кіраваньня. То бок тэхналёгія кіраваньня адукацыяй у пэрыяд рэформаў — не структурна-вэртыкальная, а інфраструктурная й гарызантальная.

Адным з важных элемэнтаў інфраструктуры сыстэмы кіраваньня адукацыяй ёсьць сыстэма аўтарытэтных экспэртных меркаваньняў. Аўтарытэтныя людзі (філёзафы, мэтадолягі, спэцыялісты ў асобных аспэктах адукацыі), якія валодаюць асаблівага кшталту сучаснымі гуманітарнымі ведамі — як рабіць рэформы

адукацыі, што такое сучасная адукацыя, – робяць асаблівага кшталту паслугі структурам кіраваньня адукацыяй: кансультуюць, аналізуюць, праектуюць, праграмуюць, ажыцьцяўляюць экспэртызу, удзельнічаюць у публічных акцыях і г. д. У пэрыяд рэформаў неабавязкова ўлучаць гэтых людзей у службовыя структуры міністэрстваў і ведамстваў, аднак неабходна надзяліць іх пэўнымі паўнамоцтвамі, у тым ліку і фармаваць замовы на працы.

Мэтазгодна выразна разьмежаваць функцыі і паўнамоцтвы суб'ектаў кіраваньня адукацыяй, а менавіта: хто ёсьць замоўцам на рэформу адукацыі, хто ёсьць ейным выканаўцам, хто адказвае за працэсы рэфармаваньня. *Замоўцам* на рэформу адукацыі мусіць выступаць дзяржава ў асобе прэзыдэнта, парлямэнту або Кабінэту міністраў. Разгарненьне зьместу захадаў для рэфармаваньня, іхная канкрэтызацыя могуць быць зробленыя толькі *генэральным выканаўцам рэформы* адукацыі. Ім можа быць адна або некалькі арганізацыяў, створаных адмыслова пад заданьне праектаваньня, праграмаваньня і рэалізацыі рэформы адукацыі. Фармаваньне такой арганізацыі (або арганізацыяў) знаходзіцца ў кампэтэнцыі парлямэнту. У цяперашні момант мы можам апісаць толькі пазыцыйную структуру генэральнага выканаўцы:

- аргкамітэт у складзе старшыні Камісіі парлямэнту ў справах адукацыі, міністра адукацыі, прэзыдэнта Акадэміі навук, аўтара Канцэпцыі рэформы адукацыі (або ўласьніка *know how*);
- група падрыхтоўкі Дэклярацыі і Мэмарандуму рэформы з прадстаўнікоў дзяржаўнага апарату і грамадзкіх арганізацыяў і структураў;
- міжпрафэсійны калектыў распрацоўнікаў Канцэпцыі рэформы, бізнэс-пляну (бюджэту і каштарысу) і новага Закону аб адукацыі;
- група арганізацыйнага праектаваньня й сыстэмнага праграмаваньня рэформы;
- група стандартызацыі, мэтралёгіі й кваліметрыі;
- часовы навучальны цэнтар, які забясьпечвае навучаньне, падрыхтоўку й правядзеньне кваліфікацыі ў працэсе ажыцьцяўленьня рэформаў, а таксама кансультаваньне навукова-дасьледчых пэдагагічных установаў, інстытутаў падвышэньня кваліфікацыі і ўдасканаленьня настаўнікаў, пэдагагічных ВНУ.

Усе гэтыя калектывы і групы ажыцьцяўляюць працу паводле ўласных праграмаў і плянаў, але ў самым цесным узаемадзеяньні адно з адным на ўсіх этапах падрыхтоўкі і ажыцьцяўленьня рэформы, якое забясьпечваецца аргкамітэтам.

Пасьля фармаваньня аргкамітэту і прыняцьця Дэклярацыі й Мэмарандуму рэформы, а таксама першай абагульненай вэрсіі Канцэпцыі неабходны падрыхтоўчы пэрыяд цягам у адзін год. Агульная колькасьць працаўнікоў і спэцыялістаў, занятых у падрыхтоўчым пэрыядзе, складзе каля тысячы чалавек. Апрача ўласна распрацоўкі Праекту і Праграмы рэформы ды ўсіх пералічаных дакумэнтаў падрыхтоўчы пэрыяд прадугледжвае комплекс арганізацыйных дзеяньняў, кансультацыяў і ўзгадненьняў, тлумачэньне мэтаў і задачаў, сэнсу і зьместу самой рэформы і падрыхтоўчага этапу (сэмінары, працоўныя нарады, інструкцыйныя лісты, мэтадычныя дапаможнікі і ўказаньні), а таксама лабіраваньне, узгадненьне і зацьвярджэньне ўва ўсіх інстанцыях. Каардынацыя і кіраваньне гэтак складаным комплексам працаў магчымыя толькі пры высокай ступені цэнтралізацыі на найвышэйшым узроўні. Магчыма, што дзеля каардынацыі ўсёй гэтай працы мусіць быць зацьверджана адмысловая пасада ў рангу часовага чальца ўраду (напрыклад, міністра без партфэля ў справах рэформы адукацыі) з паўнамоцтвамі на два—тры гады.

Адначасова з стварэньнем органаў часовага кіраваньня рэформай адукацыі ажыцьцяўляецца рэарганізацыя сталых органаў кіраваньня адукацыяй. На базе існага Міністэрства адукацыі ствараецца Міністэрства адукацыі і навукі, якое рэалізуе стандартызацыю і ліцэнзаваньне ўстановаў адукацыі. Працаўнікі старога Міністэрства адукацыі праходзяць працэдуру настрыфікацыі й атэстацыі. З новага Міністэрства адукацыі здымаецца функцыя жорсткага адміністраваньня й кантролю ўсіх ступеняў адукацыі і ўсіх сфэраў дзейнасьці адукацыі. Міністэрства адукацыі адказвае перадусім за выкананьне стандартаў адукацыі, зафіксаваных у Законе «Аб адукацыі» і іншых нарматыўных дакумэнтах, а таксама за фармаваньне мэханізмаў і працэдураў выкананьня Закону. У поўным падпарадкаваньні Міністэрству адукацыі застаюцца школы і ўстановы адукацыі, якія забясьпечваюць абавязковы ўзровень адукацыі, гарантаваны Канстытуцыяй. Установы адукацыі, што ажыцьцяўляюць прафэсійную падрыхтоўку (СПТВ, ССНУ, ВНУ), навуковыя

й дасьледчыя інстытуты забясьпечваюцца акадэмічнымі свабодамі і ажыцьцяўляюць сваю дзейнасьць ува ўмовах рынку адукацыйных паслугаў. Дзяржава ў асобе Міністэрства адукацыі таксама ўдзельнік рынку адукацыйных паслугаў, яна можа разьмяшчаць замовы, засноўваць свае навучальныя ўстановы і г. д., але кіруецца правіламі і нарматывамі рынкавай дзейнасьці. Навязваць жа волю і ўмовы разьвіцьця для іншых навучальных установаў гэтае міністэрства ня мае права. Пэўныя паўнамоцтвы й свабоды ў кіраваньні адукацыяй атрымліваюць рэгіянальныя (мясцовыя) органы кіраваньня. Яны маюць права засноўваць свае рэгіянальныя прафэсійныя навучальныя ўстановы, ажыцьцяўляць іхнае фінансаваньне і фармаваць праграмы іхнага разьвіцьця.

Так званае дзяржаўнае «сярэдняе» зьвяно кіраваньня адукацыяй (рана, аблана, гарана) цалкам або часткова ліквідуецца, то бок зь іх здымаецца кантрольная й ідэалягічная функцыі. Замест іх ствараюцца рэгіянальныя інспэктараты, якія рэалізуюць адміністрацыйныя, кансультацыйныя, інфармацыйныя і аўдытарскія функцыі. Рэарганізацыя рэгіянальных органаў кіраваньня адукацыяй адбываецца паралельна і ўзгоднена з тэрытарыяльна-адміністрацыйнай рэформай у Беларусі.

Спыняецца ўмяшаньне й абмежаваньні дзейнасьці для недзяржаўных установаў адукацыі і адукацыйнай інфраструктуры, заканадаўча гарантуецца разьвіцьцё розных сэктараў адукацыі: канфэсійнай, грамадзянскай, бізнэс-адукацыі, адукацыі для дарослых, адукацыі праз усё жыцьцё і г. д.

Міністэрства адукацыі ў працэсе стандартызацыі ўсталёўвае асноўныя прынцыпы *тыпалёгіі навучальных установаў*, якая мае статус адукацыйнага стандарту, на падмурку якога робіцца намінацыя, перанамінацыя і ліцэнзаваньне навучальных установаў. Навуковае абгрунтаваньне такой тыпалёгіі на сёньняшні дзень у Беларусі сфармаванае групай У. Мацкевіча на базе разрозьненьня працэсаў падрыхтоўкі і адукацыі, навучаньня і выхаваньня, забесьпячэньня пісьменнасьці. Гэта дае магчымасьць адрозьніваць тыпы навучальных установаў паводле ўсіх ступеняў сыстэмы бесьперапыннае адукацыі: інстытуты ад унівэрсытэтаў, каледжы ад тэхнікумаў, агульнаадукацыйныя школы ад гімназіяў ды ліцэяў. А таксама дазваляе ўводзіць базавыя рамкі і крытэры праектаваньня зьместу адукацыі ў тых ці іншых навучальных установах, фармаваць тыпалягічныя

адзінкі адукацыйных праграмаў. Ува ўмовах рынку адукацыйных паслугаў асноўны прынцып стварэньня навучальных установаў, якім мае кіравацца сыстэма кіраваньня, — прынцып шматлікасьці і разнастайнасьці адукацыйных паслугаў.

У працэсе рэфармаваньня асаблівы статус і функцыянальнае месца набываюць навуковыя інстытуты і пэдагагічныя ўнівэрсытэты. Пэдагагічная навука мусіць таксама рэфармавацца, як і ўся сыстэма адукацыі. Таму ў пэрыяды рэфармаваньня мусіць зьмяняцца тэматыка навуковых досьледаў.

Адным з асноўных элемэнтаў кіраўнічай інфраструктуры робіцца падрыхтоўка й перападрыхтоўка мэнэджэраў адукацыі ў адпаведнасьці з новымі прынцыпамі кіраваньня. Новыя мэнэджэры адукацыі мусяць скласьці кадравую рэзэрву для зьмены старых кіраўнічых кадраў. Пляцоўкамі для такога кшталту падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі могуць зрабіцца Акадэмія пасьлядыплёмнай адукацыі, Беларускі дзяржаўны ўнівэрсытэт, інстытуты падвышэньня кваліфікацыі і пэдагагічныя ўнівэрсытэты, недзяржаўныя ВНУ, якія шчыльна ўзаемадзеюць з часовымі і сталымі органамі кіраваньня адукацыяй, а таксама зь вядучымі беларускімі экспэртамі. На сёньняшні дзень у Беларусі ўжо існуюць адукацыйныя праграмы дзеля падрыхтоўкі мэнэджэраў адукацыі — у Рэспубліканскім інстытуце прафэсійнай адукацыі, Акадэміі пасьлядыплёмнай адукацыі, пэдагагічным унівэрсытэце. Яны адрозьніваюцца паводле задумы і тэхналёгіяў, аднак ужо цяпер дазваляюць ствараць кадравую рэзэрву і пэўнага кшталту «новае» кіраўнічае мысьленьне.

Дзеля рэалізацыі прынцыпу рынкавасьці ў адукацыі мае зьмяніцца схема фінансаваньня адукацыі. Рынкавая схема супярэчыць жорсткім разьмеркавальным схемам камандна-адміністрацыйнага кіраваньня. Па-першае, зьмяняецца схема дзяржбюджэтнага фінансаваньня. У нацыянальным бюджэце закладаюцца і разрозьніваюцца артыкулы на функцыянаваньне сыстэмы адукацыі і на рэформу. Частка бюджэту на функцыянаваньне ідзе на дэкляраваныя артыкулы. Другая частка рэалізуецца паводле ваўчарнай схемы фінансаваньня, калі бюджэт разьмяркоўваецца не на ўстановы, а на навучэнцаў. Кожны навучэнец атрымлівае сваю квоту (ваўчар), які можа зьмясьціць у тую ці іншую навучальную ўстанову. Тым самым закладаецца некалькі крыніцаў фінансаваньня навучальных установаў: беспасярэдне зь дзяржбюджэту і ад навучэнцаў. Таксама

ўводзіцца крэдытная сыстэма фінансаваньня. Крэдыт могуць атрымліваць як самі студэнты або іхныя бацькі, так і навучальныя ўстановы. Рэгіянальныя бюджэты набываюць адносную самастойнасьць ад агульнанацыянальнага, таму могуць разьмяшчаць свае сродкі ў адпаведнасьці з сваім рэгіянальным заканадаўствам.

Зьмест адукацыі

Рамкі прынятага ў Эўропе зьместу адукацыі ў найбольш агульным выглядзе пазначаныя ў Балёнскай дэклярацыі. Пры гэтым кожная нацыянальная сыстэма адукацыі захоўвае сваю своеасаблівасьць. Арыентуючыся на эўрапейскія ўзоры, у Беларусі неабходна вырашыць шэраг праблемаў, якія засталіся ў спадчыну ад савецкай адукацыі.

Рэформа зьместу адукацыі палягае ў замене *веднай парадыгмы адукацыі на дзейнасную й мысьленчадзейнасную*. У спадчыну ад савецкай пэдагогікі беларускім пэдагогам дасталося цьверджаньне, што веданьне навучае мысьленьню, навучыць дзейнасьці можна толькі праз веданьне. Прыярытэт веднай парадыгмы, накладзены на вельмі адладжаную клясна-ўрочную сыстэму і прадметную структуру навучальных плянаў і праграмаў, дазваляў вельмі доўгі час выхоўваць так званага «маладога будаўніка камунізму», за якога падумае партыя і ўрад, і які мусіць вельмі дакладна выконваць іх волю. У выніку на пачатак 1990-х гг. беларусы ў масе сваёй выявіліся ня ў стане ажыцьцяўляць зьмены і ўладкоўваць уласнае жыцьцё ў новых умовах. Беларусы шмат ведаюць, але ня могуць самастойна прымаць рашэньні, ня могуць правільна і цывілізавана памаўляцца, ня кажучы пра тое, што цэлыя пласты сусьветнай культуры доўгі час былі для іх папросту закрытыя й невядомыя.

Ведная парадыгма адукацыі сфармавала асаблівага кшталту пэдагагічнае мысьленьне, заснаванае на ўяўленьнях савецкай пэдагогікі, якая не адрозьнівала мноства мэтаў і працэсаў, што адбываюцца ў адукацыі. Навучаньне, выхаваньне, адукацыя, падрыхтоўка, пісьменнасьць для беларускіх пэдагогаў гучаць як сынонімы, зьмест адукацыі значыць папросту намінацыю навучальнага матэрыялу ў навучальных праграмах і падручніках, дзейнасьць зводзіцца да навыкаў, тэхналёгіі адукацыі зьведзеныя да мэтодыкаў навучаньня, а якасьць адукацыі

да якасьці ведаў, то бок узроўню навучанасьці. Такія звужаныя ўяўленьні пра адукацыю і зьмест адукацыі не дазваляюць сыстэмна «даводзіць» рэформу адукацыі беспасярэдне да навучальных установаў, да канкрэтнага вучня, не дазваляюць перабудоўваць адукацыйныя праграмы, праектаваць новыя тэхналёгіі адукацыі.

Таму першым крокам у рэформе зьместу адукацыі мусіць зрабіцца працэс татальнага перанавучаньня і перападрыхтоўкі кіраўнікоў і пэдагогаў. Гэты працэс можна інакш назваць як працэс «разафармленьня мітаў і пэдагагічнай асьветы». Папярэдне неабходна напоўніць новым зьместам саму пэдагогіку і ўвесь комплекс гуманітарных дысцыплінаў, якія суправаджаюць пэдагогіку: філязофію, мэтадалёгію, псыхалёгію. Неабходна ў зьмест пэдагагічнай адукацыі ўлучыць дысцыпліны агульнагуманітарнага характару: эпістэмалёгію, гермэнэўтыку, лёгіку, сацыялёгію, сэмантыку, сэміётыку, рыторыку і г. д., то бок неабходна адпачатна зьмяніць сам зьмест пэдагагічнай адукацыі і толькі потым зьмяняць зьмест у навучальных установах.

Зьмена веднай парадыгмы на дзейнасную значыць, што асноўнай мэтай адукацыі робіцца навучаньне ня гэтак ведам, а хутчэй спосабам дзейнасьці і мысьленьня. Як толькі адбываецца такая пераарыентацыя асноўных мэтаў адукацыі, мы сутыкаемся з цэлай сэрыяй тэхналягічных праблемаў у адукацыі.

Існая клясна-ўрочная сыстэма, распаўсюджаная ня толькі ў школах, але і ў навучальных установах прафэсійнай адукацыі, ажно да ВНУ, стаецца перашкодай у дасягненьні дзейнасных мэтаў. Адсюль асноўная задача рэфармаваньня адукацыі — зьмена тэхналёгіяў адукацыі, праектаваньне новых тэхналёгіяў, адэкватных пастаўленаму заданьню.

Прадметная і прадметна-тэматычная структура навучальных і навучальна-тэматычных праграмаў таксама не дазваляе якасна ажыцьцяўляць трансьляцыю дзейнаснага зьместу адукацыі. Асабліва востра гэтая праблематыка пачынае праяўляцца ўва ўмовах шматмоўя, полікультурнасьці, навуковай шматпадыходнасьці. Праз гэта ўжо цяпер адпрацоўваюцца вэрсіі рознага кшталту інтэграваных прадметаў, мэтапрадметаў, модуляў і г. д.

Пытаньне можна разглядаць глыбей: як усю прадметную шматстайнасьць аб'яднаць у сыстэму і забясьпечыць цэльнасьць навучальнага працэсу? З мэтадалягічнага гледзішча адказ досыць просты: зьмест і структура навучальных плянаў залежыць ад навучальных мэтаў і заданьняў (рамак дзейнасьці). У адпаведнасьці з пастаўленымі канкрэтнымі мэтамі адпрацоўваецца тэхналёгія адукацыі з адпаведным зьместам адукацыі і формай ягонага ўпакаваньня. У адпаведнасьці з пастаўленымі мэтамі ажыцьцяўляецца ацэнка якасьці і вынікаў адукацыі.

У Беларусі мусіць быць мноства адукацыйных паслугаў. Нельга ўсе адукацыйныя заданьні вырашыць у адным навучальна-выхаваўчым працэсе, таму неабходна дасягаць шматлікасьці заданьняў праз шматлікасьць адукацыйных паслугаў, іхныя камбінацыі і комплексы (тэхналёгія «супэрмаркету») і даваць права студэнтам, навучэнцам, іхным бацькам самім выбіраць паслугі і будаваць свае ўласныя адукацыйныя траекторыі.

Такім чынам, рэформа зьместу адукацыі ў Беларусі мусіць улучаць наступныя этапы:

- перагляд зьместу й тэхналёгіяў пэдагагічнай адукацыі, падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі кадраў, падрыхтоўкі спэцыялістаў найвышэйшай катэгорыі (асьпірантура, магістратура, мэнэджмэнт). Як адзін з варыянтаў інстытуцыйнага зьмяненьня пэдагагічнай адукацыі можа быць прапанаваны варыянт закрыцьця пэдагагічных унівэрсытэтаў і паступовы перанос пэдагагічнай адукацыі на базу ўнівэрсытэтаў;
- рэформа навуковых, мэтадычных і навучальна-мэтадычных службаў у сыстэме адукацыі, іхная пераарыентацыя ад веднай парадыгмы на дзейнасную;
- фармаваньне стандартаў, падручнікаў і навучальна-мэтадычных комплексаў новага пакаленьня;
- навуковая распрацоўка крытэраў новага зьместу адукацыі і фармаваньне службаў экспэртызы, ліцэнзаваньня, інспэкцыі, акрэдытацыі, сыстэмы маніторынгу якасьці адукацыі;
- паступовае фармаваньне рынку адукацыйных паслугаў з захаваньнем дазвольнага, а не забараняльнага прынцыпу.

Пэдагагічная навука

Праблемы беларускай адукацыі мусяць вырашацца беларускімі вучонымі. Падручнікі беларускіх школаў мусяць пісацца беларускімі аўтарамі. Праблемы рэфармаваньня й разьвіцьця сыстэмы адукацыі мусяць быць тэмамі досьледаў у нацыянальных навуковых інстытутах. Вынікі гэтых досьледаў мусяць трапляць у зьмест навучаньня ўва ўнівэрсытэтах і пэдагагічных ВНУ. Сёньня тэматыка навуковых досьледаў беларускіх вучоных абмяжоўваецца праблемамі ўроку, асобных навучальных курсаў або асобнай школы. Праблемы кіраваньня адукацыяй на нацыянальным і нават рэгіянальным узроўнях застаюцца па-за інтарэсамі беларускай навукі, гэтаксама як і найбольш вострыя праблемы рэформы адукацыі. Сёньня зьмест пэдагагічнай навукі моцна звужаны. Ён зводзіцца да дыдактыкі, школазнаўства і псыхалёгіі. Шмат у чым не прапрацаванымі застаюцца праўныя, сацыялягічныя, маркетынгавыя, кіраўнічыя, культуралягічныя, антрапалягічныя і шмат якія іншыя праблемы сыстэмы адукацыі.

Паміж навуковымі і навучальнымі інстытутамі мусіць быць забясьпечаны інтэнсіўны абмен кадрамі, ідэямі, мэтадамі і ведамі. Трэба падвысіць сацыяльную, прафэсійную й геаграфічную мабільнасьць прафэсарска-выкладчыцкіх і навуковых кадраў. Беларускія вучоныя і выкладчыкі мусяць мець магчымасьць працаваць, практыкавацца й стажавацца ў Эўропе, перамяшчацца ў межах краіны, працуючы ў розных унівэрсытэтах і навуковых цэнтрах.

Толькі праз інтэнсіўную й дынамічную навуку ў краіне мы можам захоўваць высокі ўзровень навучаньня ў вышэйшай, прафэсійнай і сярэдняй школе.

Гуманістычныя аспэкты (сямейныя вартасьці, інтарэсы асобы, правы дзіцяці)

Цягам 20 гадоў, пачынаючы з апошняй рэформы адукацыі ў СССР, пра гуманізм, інтарэсы дзіцяці і г.д. гаварылася вельмі шмат, але практычна нічога з задуманага не было рэалізавана. Інтарэсы асобы і правы дзіцяці могуць захоўвацца ў поўнай ступені толькі ў дэмакратычнай сыстэме, пры нармальным

функцыянаваньні ўсіх яе зьвёнаў, з сучасным зьместам адукацыі. Прычым захаваньне інтарэсаў асобы і правоў дзіцяці магчымае толькі тады, калі сама асоба і прадстаўнікі дзіцяці (перадусім бацькі) могуць уплываць на прыняцьце рашэньняў у кіраваньні адукацыяй. Дзеля дасягненьня гэтага і мусіць праводзіцца рэформа адукацыі.

Шляхі ажыцьцяўленьня рэформы адукацыі

Прыярытэты рэфармаваньня

Насуперак распаўсюджанаму меркаваньню, адукацыя насамрэч не зьвязаная зь іншымі сфэрамі грамадзкага жыцьця простымі прычынна-выніковымі залежнасьцямі. Дэкляраваньне наяўнасьці такіх простых прычынна-выніковых залежнасьцяў часта выступае ідэалягічным абгрунтаваньнем рэформаў адукацыі або, наадварот, адсутнасьці рэформаў. Найчасьцей выказваюцца дзьве вэрсіі, простая і зваротная:

1. Добрая адукацыя ў краіне ёсьць прычынай эканамічнага разьвіцьця.
2. Добры эканамічны стан ёсьць прычынай таго, што грамадзтва можа дазволіць сабе добрую сыстэму адукацыі.

Тыя, хто прытрымліваецца першай вэрсіі залежнасьці паміж эканамічным разьвіцьцём і разьвіцьцём адукацыі, настойваюць на правядзеньні неадкладных рэформаў менавіта ў адукацыі, адсоўваючы ў бок эканамічныя праблемы.

Другія прапаноўваюць адкласьці рэформу адукацыі «да лепшых часоў», працягваюць настойваць на прынцыпе «рэшткавага фінансаваньня», то бок на адукацыю выдаткоўваецца толькі тое, што застаецца ад іншых расходаў бюджэту.

Як паказвае сусьветны досьвед, у багатых краінах, зазвычай, адукацыя лепшая, чымся ў бедных. Але той самы досьвед сьведчыць і пра тое, што ў некаторых багатых краінах сустракаецца архаічная і вельмі кепская адукацыя, а ў асобных бедных краінах існуе вельмі добрая адукацыя, але яна не стаецца прычынай іхнага эканамічнага, культурнага разьвіцьця, як, зрэшты, і не стаецца прычынай прагрэсу ў палітыцы й грамадзкім жыцьці. Таму слушней зьвязваць разьвіцьцё

сфэры адукацыі зь іншымі сфэрамі грамадзкага жыцьця сынэргетычнымі, а ня простымі прычынна-выніковымі залежнасьцямі. То бок разьвіцьцё кожнай асобнай сфэры ўплывае на разьвіцьцё ўсіх іншых сфэраў, але і на сабе адчувае ўплыў усіх іншых.

Выходзячы з такога ўяўленьня, мы ня можам настойваць на прыярытэтнасьці якой-колечы рэформы самой зь сябе. Рэформы ў эканоміцы, палітыцы, войску, адукацыі і г. д. мусяць праводзіцца комплексна. Посьпех кожнай з рэформаў паасобку вызначаецца пасьпяховасьцю ўсіх астатніх. Гэта не выключае таго, што нейкія асобныя рэформы могуць быць больш прадуманымі, чым іншыя, ажыцьцяўляцца прасьцей, супраціў ім можа быць меншы, тым часам як іншыя рэформы ўдаюцца горш. Раней ці пазьней, такая рассынхранізацыя прывядзе да праблемаў і ў тых сфэрах, дзе рэформы ажыцьцяўляюцца пасьпяхова.

Бедныя краіны нічога не выйграюць ад таго, што выдаткоўваюць свае рэсурсы на стварэньне добрай сыстэмы адукацыі, бо пакутуюць ад «уцёкаў мазгоў». Багатыя ж краіны з заганамі ў адукацыі лёгка купляюць сабе спэцыялістаў патрэбнай кваліфікацыі або дазваляюць сваім грамадзянам карыстацца паслугамі адукацыі ў іншых краінах. Гэта асабліва характэрна ўва ўмовах глябалізацыі ўсіх галінаў жыцьця і дзейнасьці ў сучасным сьвеце.

Ідэальная мадэль рэформы адукацыі ў кожнай асобнай краіне прадугледжвае перадусім дасягненьне грамадзкае згоды што да мэтаў і прынцыпаў нацыянальнай адукацыі. Ідэальная мадэль — гэта ня нейкі рэцэпт для кожнай краіны і кожнай сытуацыі, а кампраміс, дасягнуты ў вызначэньні прыярытэтаў нацыянальнага разьвіцьця ў цэлым. Таму канцэпцыя рэформы адукацыі мусіць утрымліваць у сабе частку, якую можна трактаваць як стратэгію дасягненьня такога кампрамісу.

Стратэгія дасягненьня грамадзкае згоды і кампрамісу што да разьвіцьця нацыянальнай сыстэмы адукацыі прадугледжвае прынамсі тры блёкі, тры тыпы мэханізмаў разьвіцьця:

1. *Дэмакратычныя мэханізмы.* Шырокае грамадзкае абмеркаваньне, праўнае рэгуляваньне прыняцьця рашэньняў на агульнанацыянальным і мясцовым узроўнях, раўнапраўе ўсіх грамадзянаў у атрыманьні адукацыі, крытыка і гра-

мадзкі кантроль у сфэры адукацыі, палітычная значэннасьць праблемаў адукацыі.

2. *Рынкавыя мэханізмы*: Балянс попыту й прапановы на адукацыйныя паслугі, эканамічная рацыянальнасьць выдаткаў на адукацыю (як грамадзкіх бюджэтных выдаткаў, так і асабістых расходаў кожнага навучэнца, чалавек мусіць разумець мэтазгоднасьць адукацыі — чым больш вучыцца, тым больш зможаш потым зарабляць, але не наадварот), канкурэнтаздольнасьць нацыянальнай адукацыі на сусьветным рынку кваліфікацыяў і адукацыйных паслугаў.
3. *Прафэсійныя мэханізмы*: Стан пэдагагічнай навукі, кваліфікацыя і кампэтэнтнасьць настаўнікаў і мэнэджэраў сыстэмы адукацыі, кампэтэнтнасьць палітыкаў у галіне праблемаў адукацыі, адпаведнасьць нацыянальных стандартаў адукацыі сусьветным або эўрапейскім.

Праблемы і неадкладныя заданьні

Адначасовае дзеяньне трох названых мэханізмаў натыкаецца на шэраг супярэчнасьцяў. Гэтак, рынкавыя мэханізмы часта зьвязаныя з так званымі непапулярнымі мэтадамі, значыць, сустракаюць супраціў з боку кансэрватыўнай бальшыні, што ўскладняе працу дэмакратычных мэханізмаў. Самі дэмакратычныя мэханізмы сустракаюць супраціў з боку прафэсійнай супольнасьці, бо ўсякае рэфармаваньне зьвязанае зь зьменай структуры кваліфікацыі і кампэтэнтнасьці. Значная частка прафэсійнай супольнасьці ўвадначас можа зрабіцца некампэтэнтнай і функцыянальна непісьменнай пры зьмяненьні ўмоваў дзейнасьці, але працягвае ўдзельнічаць у працэсе выпрацоўкі і прыняцьця рашэньняў.

Усё гэта прыводзіць да парадаксальнага стану. Хоць большая частка прафэсійнай супольнасьці працаўнікоў адукацыі і грамадзтва ў цэлым і прызнаюць неабходнасьць рэформаў, у прыватнасьці ў адукацыі, аднак, разам з тым гэта самая бальшыня можа ня толькі не падзяляць рэфарматарскіх вартасьцяў і ідэяў, але часьцяком і прытрымлівацца проста супрацьлеглых поглядаў на рэформу, не падзяляць тых прынцыпаў, якія закладаюцца ў рэформу самімі рэфарматарамі.

Пералічым яшчэ раз чатыры варыянты Канцэпцыі рэформы адукацыі, пра якія ўжо гаварылася вышэй:

1. Пастанова Рады Міністраў Рэспублікі Беларусі ад 12 красавіка 1999 г., № 500 *«Аб асноўных кірунках разьвіцьця нацыянальнай сыстэмы адукацыі»* і афіцыйна абвешчаная рэформа школьнай адукацыі.
2. *«Канцэпцыя адукацыі і выхаваньня ў Беларусі»*, ухваленая Радай Міністраў Рэспублікі Беларусі 26 сакавіка 1993 г., і *«Дзяржаўная комплексная праграма разьвіцьця адукацыі і выхаваньня ў Беларусі на пэрыяд да 2000 г.»*, зацьверджаная Радай Міністраў Рэспублікі Беларусі 15 лістапада 1993 г. (Уладзімер Пархоменка і інш.), што яе дапаўняе.
3. *«Тэарэтычнае абгрунтаваньне канцэпцыі нацыянальнай школы Рэспублікі Беларусі»* і *«Канцэпцыя нацыянальнай школы Беларусі»* 1993 г. (Міхаіл Гусакоўскі і інш.).
4. *«Аргпраект рэформы адукацыі Рэспублікі Беларусі», «Канцэпцыя абнаўленьня гуманітарнай адукацыі»*, што яго дапаўняе, а таксама шэраг іншых дадаткаў да аргпраекту: *«Канцэпцыя рэформы прафэсійнай адукацыі», «Магчымы сцэнар ліквідацыі функцыянальнай непісьменнасьці пры зьменах вонкавых палітычных і эканамічных фактараў»* і інш. (Уладзімер Мацкевіч і інш., 1996 г.).

Праблема палягае ня толькі ў тым, што тры апошнія канцэпцыі мала вядомыя шырокай публіцы і прафэсійнай супольнасьці, але і ў тым, што ўсе пералічаныя падыходы істотна адрозьніваюцца паводле мэханізмаў рэалізацыі, паводле філязофска-тэарэтычнага абгрунтаваньня, паводле мэтаў, вартасьцяў і прынцыпаў.

Кожная з названых канцэпцыяў мае сваіх прыхільнікаў і супраціўнікаў, за кожнай зь іх стаіць (альбо можа стаяць) пэўная група інтарэсаў. Таму ніводная ня можа быць пакладзеная ў падмурак рэфармаваньня адукацыі беспасярэдне. Патрэбнае грамадзкае абмеркаваньне, крытыка, экспэртыза, узгадненьне і давядзеньне да паўніні. У выніку мусіць атрымацца некалькі дакумэнтаў, якія фіксуюць блёк мэтаў рэформы адукацыі.

Узгадненьне мэтаў

1. *Дактрына адукацыі ў Рэспубліцы Беларусі.* У гэтым дакумэнце пастулююцца вартасьці, рамкі, асноўныя прынцыпы, ідэалы і арыентацыя новай рэфармаванай адукацыі на тыя ці іншыя эўрапейскія і сусьветныя стандарты. Пры простасьці й сьцісласьці такога дакумэнту будзе вельмі цяжка дасягнуць згоды паводле ўсіх гэтых пазыцыяў.

2. *Канцэпцыя рэформы.* Ува ўводзінах да гэтага дакумэнту даецца тэарэтычнае абгрунтаваньне новага зьместу, структуры і арганізацыі рэфармаванай адукацыі, апісваюцца элемэнты, сувязі і адносіны ў сыстэме, базавыя працэсы і функцыі. Канцэпцыя рэформы робіцца асновай для пэдагагічнай адукацыі і падвышэньня кваліфікацыі на пэрыяд рэформаў. Такая канцэпцыя можа быць распрацаваная на базе трох з наяўных на цяперашні момант канцэпцыяў, праз узаемнае дапаўненьне тымі разьдзеламі, якія адсутнічаюць у іншых канцэпцыях, праз узгадненьне спрэчных момантаў, праз асучасьніваньне разьдзелаў і палажэньняў, што страцілі актуальнасьць. Гэта не выключае й таго, што ў выніковую канцэпцыю могуць быць улучаныя і іншыя напрацоўкі, якіх не было ў той час, калі названыя канцэпцыі распрацоўваліся. Напрыклад, неабходна ўлічыць дасягненьні апошніх гадоў у сусьветнай навуцы і міжнародным супрацоўніцтве (ідэалёгію адукацыі праз усё жыцьцё, канцэпцыю ўстойлівага разьвіцьця, досьвед разьвіцьця грамадзянскай адукацыі ў Эўропе і г. д.).

3. *Мэмарандум рэформы адукацыі.* Гэты дакумэнт складаецца дзеля таго, каб рэфармаваная адукацыя і сама рэформа адпавядалі запатрабаваньням і чаканьням усіх слаёў насельніцтва краіны і не прышчамлялі нічыіх інтарэсаў. Ён утрымлівае ў сабе прынцыпы, рамкі й абмежаваньні, за якія не павінны выходзіць ані сама рэформа, ані рэфарматары, а таксама ўзаемныя абавязкі і адказнасьць усіх удзельнікаў рэфармаваньня адукацыі. Гэта выніковы дакумэнт у дасягненьні грамадзкае згоды. Ён непазьбежна будзе вельмі кампрамісны, але інакшым і быць ня можа. Без такога мэмарандуму ўсякая канцэпцыя і праграма рэформаў будуць заканчвацца тым самым, чым канчаліся ўсе папярэднія ініцыятывы, пачынаючы з 1984 г., ня толькі ў Беларусі,

Табліца 1

Прынцыпы рэфармаваньня	Афіцыйная рэформа	Канцэпцыя адукацыі і выхаваньня ў Беларусі	Канцэпцыя нацыянальнай школы Беларусі	Канцэпцыя абнаўленьня гуманітарнай адукацыі
Дэмакратызацыя	Адмаўляецца	Прадугледжваецца з абмежаваньнямі	Прадугледжваецца	
Дэцэнтралізацыя сыстэмы кіраваньня адукацыяй	Прадугледжваецца адваротнае, умацаваньне цэнтралізацыі	Не акцэнтуецца		Прадугледжваецца
Акадэмічная аўтаномія і свабоды	У абмежаваных формах	Прадугледжваецца		
Дэпалітызацыя	Дэкляруецца, але не выконваецца	Прадугледжваецца	Не акцэнтуецца	
Сэкулярызацыя	Дэкляруецца, але рэальна робіцца іншае	Не акцэнтуецца		Прадугледжваецца
Беларусізацыя (фармаваньне беларускай культурнай ідэнтычнасьці)	Не	Памяркоўная	Актыўная	
Дывэрсіфікацыя зьместу адукацыі (альтэрнатыўнасьць падручнікаў і праграмаў)	Абмежаваная	Прадугледжваецца		
Канкурэнцыя адукацыйных паслугаў і прадуктаў	Не		Прадугледжваецца	
Сыстэмнасьць (патрабуецца экспэртыза)	Уяўленьні пра сыстэмнасьць адрозьніваюцца, кожная з канцэпцыяў распрацаваная згодна з сваім падыходам			
Адкрытасьць і сумяшчальнасьць адукацыйных праграмаў усіх узроўняў з эўрапейскімі краінамі	Дэкляруецца. У абмежаваных формах і ў кожнай з канцэпцыяў па-рознаму			

але і ў іншых краінах СНД, — правалам. Апрача ўсяго іншага, у мэмарандуме мусяць абумоўлівацца ўмовы адстаўкі міністра адукацыі і нават прэм'ер-міністра ў выпадках згарненьня, правалу або страты кіраванасьці рэформы адукацыі.

Сярэднетэрміновыя прыярытэты рэфармаваньня адукацыі

Пасьля ўзгадненьня мэтаў паглыбляецца й пашыраецца Канцэпцыя рэформы (1), распрацоўваюцца дзяржаўныя стандарты адукацыі (2), у якіх утрымліваецца дэталёвая прапрацоўка характарыстыкаў, уласьцівасьцяў і якасьцяў новай адукацыі, а таксама складаецца Аргпраект (3) структуры, функцыянаваньня і кіраваньня рэфармаванай адукацыяй.

1. Тэарэтычнае абгрунтаваньне, філязофія нацыянальнай адукацыі, тэзы і палажэньні канцэпцыі, сфармуляваныя для ўсёй сыстэмы ў цэлым, прапісваюцца датычна:

— кожнага ўзроўню адукацыі (ад дашкольнай да пасьлядыплёмнай, для ўсіх тыпаў школаў і ВНУ ўсіх формаў уласнасьці);
— кожнага з рэгіёнаў краіны;
— прынцыпаў напісаньня падручнікаў і падрыхтоўкі навучальных праграмаў.

Гэта доўгатэрміновая і вялікая праца; яна патрабуе прыцягненьня вялікай колькасьці спэцыялістаў высокай кваліфікацыі, вучоных і пэдагогаў. Яна можа быць пасьпяхова выкананая толькі тады, калі асноўныя нацыянальныя інстытуты (НІА, РІВШ, РІПА і АПА), пэдагагічныя ўнівэрсытэты, рэгіянальныя інстытуты ўдасканаленьня настаўнікаў, мэтадычныя цэнтры прымуць Дактрыну адукацыі ў Рэспубліцы Беларусі, Канцэпцыю рэформы і падпішуць Мэмарандум рэформы адукацыі. Пры гэтым усе названыя ўстановы мусяць зьмяніць тэматыку навуковых досьледаў і плянавых мэтадычных распрацовак у адпаведнасьці з гэтымі дакумэнтамі. Вядома, што дзеля гэтага спатрэбіцца падвышэньне кваліфікацыі і паскораная падрыхтоўка спэцыялістаў, вучоных, прафэсарска-выкладчыцкага складу гэтых установаў.

2. Прыняцьце стандартаў адукацыі можа зрабіцца пэўнай гарантыяй незваротнасьці рэформы адукацыі. Дзеля гэтага распрацоўка стандартаў мусіць падпарадкоўвацца асноўнаму прынцыпу: дзяржаўныя стандарты адукацыі мусяць быць сумяшчальныя з эўрапейскімі адукацыйнымі стандартамі. Сэнс стандартаў ня ў тым, што яны лепшыя або горшыя. Асноўнае заданьне стандартызацыі – сумяшчальнасьць зь іншымі сыстэмамі. Сёньня ў распрацоўцы стандартаў адукацыі ў Беларусі, з аднаго боку, вельмі шмат «самадзейнасьці», у выніку чаго выходзіць нешта зусім арыгінальнае і кепска сумяшчальнае з сыстэмамі адукацыі ў Эўропе, з другога боку, стандартызацыя максымальна захоўвае савецкі зьмест і прынцыпы адукацыі. Таму асноўным заданьнем распрацоўкі дзяржаўных стандартаў адукацыі ў Беларусі мусіць зрабіцца адаптацыя і прывязка эўрапейскіх стандартаў да нацыянальных умоваў і наяўных у Беларусі рэсурсаў.

3. Аргпраект будуецца на базе прынятых да рэалізацыі ў рэфармаваньні адукацыі know how.

Праграма пераходу ад існай сыстэмы адукацыі да новай сыстэмы адукацыі (праграма рэформаў)

Такая праграма мусіць складацца з дакумэнтаў, якія прапісваюць і вызначаюць:

1. Структуру часовых органаў кіраваньня на пэрыяд рэфармаваньня. (Гл. у гэтым тэксьце разьдзел «Рэформа кіраваньня адукацыяй».)
2. Разьмеркаваньне функцыянальных абавязкаў, правоў і паўнамоцтваў усіх рэалізатараў і выканаўцаў рэфармаваньня.
3. Плян-мапу захадаў для рэфармаваньня.
4. Сеткавы графік працаў або каляндарны плян.
5. Прынцыпы, сродкі і мэханізмы кантролю й апэратыўнага кіраваньня хадой працы.

Пераважна гэта рабочыя дакумэнты, якія дазваляюць зрабіць канцэпцыю рэалістычнай і ажыцьцяўляльнай. Прычым распрацоўка ўсіх дакумэнтаў мусіць весьціся пад грамадзкім кантролем і ўзгадняцца з Дактрынай, Канцэпцыяй і Мэмарандумам. Важнасьць гэтых дакумэнтаў вызначаецца тым, што ў кароткія тэрміны

неабходна будзе арганізаваць працу соцень і тысячаў спэцыялістаў, якія прызвычаіліся працаваць па-старому.

У сыстэме адукацыі Беларусі традыцыйна слабая мэнэджэрская падрыхтоўка спэцыялістаў. Практычна на ўсіх узроўнях кіраваньня, ад дырэктараў навучальных установаў да кіраўнікоў управаў і аддзелаў Міністэрства адукацыі. Асаблівa нізкая кваліфікацыя і кампэтэнтнасьць мэнэджэраў на сярэднім узроўні (аблана, гарана, рана) і ў навукова-мэтадычных інстытутах і цэнтрах, дзе спэцыялісты ня маюць цэльнага бачаньня сыстэмы, ня маюць доступу да інфармацыі, не прывыклі аналізаваць сытуацыю й прымаць самастойныя рашэньні. Усё гэта прыводзіць да парадаксальных сытуацыяў. Характэрным прыкладам можа выступаць факт, які мае дачыненьне да рэалізацыі афіцыйнай рэформы. З 1 верасьня 2002 г. беларускія школы перайшлі з 5-бальнай сыстэмы адзнакаў на 10-бальную. Першыя мэтадычныя матэрыялы паводле 10-бальнай сыстэмы пачалі паступаць у школы толькі праз месяц пасьля пачатку навучальнага году. Падрыхтаваныя ў пасьпеху, яны былі не зразумелыя настаўнікам і вучням. Мэтадысты таксама не былі гатовыя да ўвядзеньня 10-бальнай сыстэмы. У выніку школу ліхаманіла больш за паўгоду. Былі прэцэдэнты, калі ў асобных школах даводзілася ануляваць усе адзнакі за паўгоду навучаньня. Распаўсюджанай зрабілася практыка, калі ў школе ўводзяцца новыя прадметы або новыя праграмы з традыцыйных прадметаў, а падручнікі яшчэ ня выдадзеныя (часам і не напісаныя), мэтадычныя распрацоўкі адсутнічаюць, падрыхтаваных настаўнікаў няма. Пры такім плянаваньні й праграмаваньні працаў можа быць дыскрэдытаваная самая геніяльная канцэпцыя. Таму пры канцы 2002 г. сацыялягічныя апытаньні паказвалі, што блізу 80% насельніцтва нэгатыўна ставяцца да ажыцьцяўлянай рэформы адукацыі.

Параўнальныя кваліфікацыйныя патрабаваньні

Неабходна распрацаваць і ўвесьці параўнальныя кваліфікацыйныя патрабаваньні да рэалізатараў і выканаўцаў рэформаў, а таксама ўсіх працаўнікоў рэфармаванай сыстэмы адукацыі.

Першы дакумэнт (для рэалізатараў і выканаўцаў рэформаў) мусіць утрымліваць патрабаваньне ведаць усе канцэптуальныя і праграмныя дакумэнты

рэформы адукацыі і дзеяць у адпаведнасьці зь імі. Гэта датычыць найперш мэнэджэраў, чыноўнікаў і палітыкаў (службовыя асобы на выбарных пасадах і міністар адукацыі).

Вышэй ужо падкрэсьлівалася нізкая кваліфікацыя і некампэтэнтнасьць мэнэджэраў адукацыі, у той час як падрыхтоўка і рэалізацыя рэформы запатрабуе прыцягненьня тысячаў спэцыялістаў. Знайсьці некалькі дзясяткаў удзельнікаў ЧНДК, часовых органаў кіраваньня на пэрыяд рэфармаваньня можна будзе досыць лёгка, але замяніць тысячы міністэрскіх працаўнікоў, мэнэджэраў усіх узроўняў, мэтадыстаў зусім немагчыма. Кадравая праблема будзе сур'ёзнай пагрозай рэформе. Спатрэбіцца інтэнсіўная паскораная перападрыхтоўка пэрсаналу. Можна разьлічваць і на самападрыхтоўку і самаадукацыю задзеяных у рэфармаваньні спэцыялістаў. Але ім спатрэбіцца тэарэтычная і мэтадычная дапамога ў выглядзе мэтадычных дапаможнікаў, інструкцыяў, дэманстрацыйных матэрыялаў. Усё гэта можна распрацаваць у кароткія тэрміны толькі тады, калі будуць прапісаныя кваліфікацыйныя патрабаваньні да ўдзельнікаў рэфармаваньня.

Кваліфікацыйныя патрабаваньні да ўсіх працаўнікоў рэфармаванай сыстэмы адукацыі — гэта фактычна дзяржаўныя стандарты пэдагагічнай адукацыі, падвышэньня кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў у сыстэме адукацыі.

Праект бюджэту рэфармаванай адукацыі

Пабудова бюджэту сыстэмы адукацыі практычна не зьмянілася з савецкіх часоў, хаця сама эканоміка адукацыі перажыла істотныя зьмены пад уплывам рынку. Прынцыпы пабудовы адукацыйнага бюджэту на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях мусяць быць прыведзеныя ў адпаведнасьць з эканамічнай рэальнасьцю. Неабходна ўвесьці ўва ўжытак сучасныя формы фінансаваньня адукацыі (ваўчарны прынцып, крэдытаваньне і г. д.).

Каштарыс выдаткаў і капітальных укладаньняў у рэфармаваньне

Рэформа адукацыі ня можа быць бясконцай. Рэформа — гэта разавая рэч. Нельга плянаваць расходы на рэформу ў агульным бюджэце адукацыі. Рэформа мусіць фінансавацца па асобных артыкулах. Значыць, мусіць быць праведзеная ацэнка кошту рэформы. Распрацоўка канцэпцыяў, праектаваньне і плянаваньне — гэта найтаньнейшая частка рэформы. Асноўныя выдаткі запатрабуюць работы, апісаныя ў аргпраекце і праграме рэфармаваньня. Толькі пасьля таго, як усё гэта будзе прапісана, будзе складзены плян-графік і плян-мапа працаў, можна ацаніць рэальны кошт рэформы.

З другога боку, акурат памеры рэальнага фінансаваньня, якія могуць быць вылучаныя зь бюджэту, прыцягненыя як інвэстыцыі, вызначаюць аб'ём і зьмест канцэпцыі рэформы адукацыі. Каштарыс рэформы адукацыі робіць Канцэпцыю рэформы рэалістычным дакумэнтам, а ня ўтопіяй. Без каштарысу ўсякая канцэпцыя можа быць толькі прадметам акадэмічнага інтарэсу.

Праект новага Закону «Аб адукацыі»

Закон «Аб адукацыі» 1991 г. адкрываў вялікія магчымасьці для зьмены адукацыі. Апошні Закон «Аб адукацыі» 2002 г., наадварот, гэтыя магчымасьці шмат у чым абмяжоўвае. Ён папросту фіксуе ўсталяваны стан рэчаў. Ёсьць два варыянты прыняцьця будучага закону. Першы: калі закон прымаецца да правядзеньня рэформы й тым самым адкрывае магчымасьці для эвалюцыі або рэформы і рэглямэнтуе яе. Другі варыянт: калі закон прымаецца пасьля рэформы і фіксуе адбытыя зьмены. У кожнага з гэтых варыянтаў ёсьць свае перавагі і заганы.

Першы варыянт добры тым, што закон можна прымаць, не прывязваючыся да канцэпцыі і праграмы рэформаў. У гэтым выпадку рэфарматарскі закон пачынае стымуляваць зьмяненьне і эвалюцыю сыстэмы. Тым больш такі закон трэба прыняць, калі няма (і не прадбачыцца ў найбліжэйшым часе) выпрацаванай канцэпцыі і праграмы рэформаў. Загана ж у тым, што калі эвалюцыя сыстэмы

адбываецца хутка ды інтэнсіўна, дык закон хутка старэе і ператвараецца ў фактар стрымліваньня рэформы.

Заганай другога варыянту ёсьць працягласьць і складанасьць падрыхтоўкі закону, бо ў яго падрыхтоўку ўцягваецца вялізная колькасьць зацікаўленых суб'ектаў, патрабуецца працаёмкая працэдура ўзгадненьня. Сам зьмест закону зьвязваецца зь зьместам канцэпцыі і праграмы рэформаў, а прыняцьце яго будзе залежаць ад ацэнкі пасьпяховасьці або непасьпяховасьці праводжаных рэформаў. І тым ня менш мае сэнс ісьці на другі варыянт. Больш за тое, калі закон будзе завяршаць рэформу адукацыі, у ім можна будзе прадугледзець і магчымасьці далейшай эвалюцыі сыстэмы.

Прыняцьце рашэньня адносна таго, ці трэба пачынаць рэфармаваньне адукацыі з прыняцьця новага Закону «Аб адукацыі», або наадварот, вызначаецца тым, які рэальны стан адукацыі ў краіне на момант пачатку яе рэфармаваньня і якую «ідэальную мадэль» адукацыі мы маем, ці ня маем яе ўвогуле.

Такім чынам, у блізкай і сярэдняй пэрспэктыве вылучана сем тыпаў дзейнасьці, якія мусяць быць арганізаваныя ў працэсе рэфармаваньня адукацыі, і сем тыпаў дакумэнтаў, якія ўяўляюць сабой прадукт пасьпяховага заканчэньня кожнага з гэтых тыпаў дзейнасьці. Важна ня толькі, каб кожны з гэтых дакумэнтаў быў кваліфікавана распрацаваны, але і каб усе дакумэнты былі прынятыя кампэтэнтнымі структурамі дзяржаўнага кіраваньня, інстытутамі або НДА. У ідэале гэтыя кампэтэнтныя структуры мусяць замаўляць распрацоўку гэтых дакумэнтаў.

Далёкая пэрспэктыва

Рэформы мусяць заканчвацца пераходам да нармальнага функцыянаваньня сыстэмы. Пасьля рэформы сыстэма адукацыі мусіць зрабіцца самарэгуляванай, адаптыўнай і разьвівацца сынхронна з сусьветнымі працэсамі.

Беларуская адукацыя ўжо дваццаць гадоў знаходзіцца ў стане рэфармаваньня безь якіх-колечы дадатных вынікаў. Адукацыя — гэта адзін з найбольш кансэрватыўных сацыяльных інстытутаў. Павага да традыцыі, стабільнасьць

і надзейнасьць – паказьнікі добрай сыстэмы адукацыі ў цэлым і асобных навучальных установаў. Традыцыі нацыянальнай адукацыі ў Беларусі пакуль што ня склаліся. Дарма што гісторыя адукацыі ў Беларусі налічвае амаль тысячу год, «найстарэйшыя» вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы ўзьніклі каля 80 год таму. Такімі яны аказаліся з тае прычыны, што няма пераемнасьці зь Віленскім унівэрсытэтам, Полацкім калегіюмам ды іншымі даўнымі навучальнымі ўстановамі. Горы-Горацкая сельскагаспадарчая акадэмія тройчы аднаўлялася на адным і тым самым месцы як новая навучальная ўстанова. Найстарэйшыя навучальныя ўстановы, як вышэйшыя, так і сярэднія, узьніклі ўжо за савецкай уладай і сфармаваныя ў савецкай, а не нацыянальнай традыцыі.

Рэсурсы і сродкі праектна-праграмных захадаў для рэфармаваньня адукацыі

Тое, што можна разумець пад рэсурсамі, ня ёсьць самастойным паняткам, бо адзін і той самы аб'ект, адна і тая самая якасьць або ўласьцівасьць могуць для аднаго заданьня выступаць як рэсурс, а для другога ўжо не. Значыць, правільная фармулёўка заданьня або ўстаноўка на пэўную дзейнасьць ёсьць падставамі для вызначэньня рэсурсу. Тут ідзе гаворка пра падрыхтоўку праекту і праграмы новай сыстэмы адукацыі, якая мусіць прыйсьці на зьмену старой. Пераход ад старой сыстэмы да новай і складае сутнасьць рэформы. У адпаведнасьці з сказаным мы можам сфармуляваць сама агульнае ўяўленьне пра рэсурсы. Рэсурс у рамках гэтага заданьня ўяўляе сабой:

- наяўнасьць людзей, гатовых прысьвяціць гэтаму заданьню свае сілы і час;
- выразнае, дакладнае разуменьне гэтымі людзьмі мэтаў, прызначэньня і сэнсу рэформы адукацыі;
- наяўнасьць у гэтых людзей дастатковага ўзроўню адукаванасьці, кваліфікацыі і падрыхтаванасьці дзеля разьвязаньня пастаўленага заданьня;
- *know how* або веды пра тое, як, паводле якога пляну, на якіх прынцыпах будзе ажыцьцяўляцца рэфармаваньне;
- грошы, дастатковыя дзеля таго, каб перавесьці наяўныя патэнцыйныя рэзэрвы ў актуальныя рэсурсы.

Табліца 2

Этап	Кампэтэнтны орган або структура (замоўца)	Выканаўца	Прадукт
1.	Парлямэнт	Дэпутацкая група, грамадзкія дзеячы і палітыкі, вучоныя-пэдагогі, экспэрты	1.1. Дактрына
	Міністэрства адукацыі	ЧНДК, нацыянальныя НДІ, унівэрсытэты	1.2. Канцэпцыя
	Агульнанацыянальны адукацыйны кангрэс (аргкамітэт кангрэсу можа быць сфармаваны выканаўцамі)	Усе зацікаўленыя ў рэформе адукацыі суб'екты	1.3. Мэмарандум
2.	Міністэрства адукацыі (галоўныя ўправы паводле ўзроўняў адукацыі), мясцовае самакіраваньне	Пэдагагічная навука, мэтадысты, экспэрты і кансультанты	2.1. Канцэпцыя
	Урад	Спэцыялісты ў стандартызацыі	2.2. Дзяржстандарт
	Аргкамітэт рэформы адукацыі	ЧНДК і НДІ	2.3. Аргпраект
3.	Аргкамітэт рэформы адукацыі	ЧНДК і НДІ	3.1. Структура праграмы
			3.2. Функцыі, правы і абавязкі
			3.3. Плян-мапа
			3.4. Графік
			3.5. Прынцыпы кантролю
4.	Замоўца Дактрыны і Мэмарандуму	Аргкамітэт рэформы адукацыі	4.1. Кваліфікацыйныя патрабаваньні
	Урад	Спэцыялісты стандартызацыі ў адукацыі	4.2. Кваліфікацыйныя патрабаваньні
5.	Парлямэнт	Урад, Мінфін і Міністэрства адукацыі	5. Бюджэт
6.	Урад	Часовыя органы кіраваньня рэформай адукацыі	6. Каштарыс
7.	Парлямэнт і ўрад	Парлямэнцкая група дзеля падрыхтоўкі закону	7. Закон

Нішто зь пералічанага вышэй у ізаляваным выглядзе ня ёсьць рэсурсам. Рэсурсам гэта можа зрабіцца, калі будзе сабранае ў адным месцы, у адзін час, дзеля разьвязаньня аднаго заданьня.

Аналізуючы сытуацыю, што склалася ў Беларусі, мы можам сьцьвярджаць, што назапашаная дастатковая рэзэрва для пачатку рэформы адукацыі.

Сфармуляваныя фрагмэнтарныя заданьні ёсьць складовымі часткамі або элемэнтамі сыстэмы рэфармаваньня. Разьвязаньне нейкага аднаго з гэтых заданьняў ізалявана ад іншых ні да чога не прывядзе. Будуць грошы пры адсутнасьці кваліфікацыі і ведаў рэалізатараў рэформы — рэформы ня будзе. Будуць веды і know how пры адсутнасьці грошай — рэформы таксама ня будзе. У цяперашні час мы маем акурат такі стан рэчаў.

Спосабы рэалізацыі прыярытэтаў рэфармаваньня (запуск рэформы)

Пачаць сапраўднае рэфармаваньне адукацыі ў Беларусі можна толькі зьмяніўшы сыстэму кіраваньня ў сфэры адукацыі, сыстэму прыняцьця рашэньняў і распрацоўкі праграмаў, праектаў і плянаў. Як мусіць быць уладкаваная сыстэма кіраваньня ў сфэры адукацыі, ужо апісвалася намі. Тут мы прывядзем толькі схему сыстэмы кіраваньня.

Пры такой сыстэме кіраваньня адукацыяй робіцца магчымым запуск рэформы, у якой бяруць шырокі ўдзел інстытуты грамадзянскай супольнасьці. Робіцца таксама магчымым рацыянальнае ўзаемадзеяньне паміж рознымі інстытутамі, дзяржавай, палітычнымі партыямі, прафэсійнымі супольнасьцямі, мясцовымі грамадамі і ўсімі зацікаўленымі суб'ектамі.

Трэба памятаць, што гэтыя крокі і этапы арганізаваныя праграмна, то бок яны могуць накладацца адзін на адзін у часе, могуць ісьці адначасова, але тым ня менш захоўваць сваё значэньне акурат як этапы рэфармаваньня.

Рысунак 1. Схема кіраваньня адукацыяй у пэрыяд рэфармаваньня